ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год. выд. 33-і
№ 61 (1906)
31 ліпеня 1964 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

29—30 ліпеня адбыўся пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі.

Пленум абмеркаваў пытанні:

1. Аб ходзе выканання пастановы чэрвеньскага [1963 г.] Пленума ЦК КПСС «Аб чарговых задачах ідэалагічнай работы партыі».

2. Аб мерах па забеспячэнню жывёлы кармамі ў наступную зімоўку.

На пленум былі запрошаны: першыя сакратары сельскіх і прамысловых абкомаў КПБ, сакратары прамысловых і сельскіх абкомаў КПБ па ідэалагічнай рабоце, старшыні прамысловых і сельскіх аблвыканкомаў, намеснікі старшынь аблвыканкомаў, якія займаюцца пытаннямі культуры, намеснікі загадчыкаў ідэалагічных аддзелаў прамысловых і сельскіх абкомаў КПБ, сакратары парткомаў вытворчых упраўленняў, першыя сакратары гаркомаў і гарайкомаў КПБ, рэдактары абласных газет, старшыні абласных камітэтаў па радыёвяшчанню і тэлебачанню, адказныя сакратары абласных аддзяленняў таварыства «Веды», начальнікі абласных упраўленняў вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў, старшыні абласных аб'яднанняў «Сельгастэхнікі», начальнікі вытворчых калгасна-саўгасных упраўленняў, першыя сакратары абкомаў ЛКСМБ, кіраўнікі і адказныя работнікі міністэрстваў і рэспубліканскіх ведамстваў, рэктары вышэйшых навучальных устаноў, сакратары партарганізацый і загадчыкі кафедраў грамадскіх навук вну, пісьменнікі, мастакі, кампазітары, кінаработнікі, работнікі тэатраў і канцэртных арганізацый, работнікі друку, радыё і тэлебачання, таварыства «Веды» БССР, група прапагандыстаў і агітатараў.

З дакладам па першаму пытанню «Аб ходзе выканання пастановы чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС «Аб чарговых задачах ідэалагічнай работы партыі» выступіў сакратар ЦК КПБ В. Ф. ШАУРА.

У спрэчках па дакладу выступілі першы сакратар Гродзенскага сельскага абкома КПБ У. Ф. МІЦКЕВІЧ, міністр асветы БССР Р. Я. КІСЯЛЁЎ, першы сакратар Мінскага прамысловага абкома КПБ А. Б. НАСІЛОЎСКІ, начальнік палітупраўлення БВА У. А. ГРЭКАЎ, першы сакратар Віцебскага прамысловага абкома КПБ У. Б. ТРУНОЎ, сакратар Гомельскага сельскага абкома КПБ А. І. ВАРАНЦОЎ, сакратар Брэсцкага сельскага абкома КПБ С. М. ШАБАШОЎ, старшыня Камітэта Дзяржаўнай бяспекі пры Савеце Міністраў БССР В. І. ПЯТРОЎ, сакратар Віцебскага сельскага абкома КПБ П. П. БЯЛЯЎСКІ, намеснік старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР І. П. ШАМЯКІН, народны мастак БССР І. О. АХРЭМЧЫК, сакратар ЦК ЛКСМБ А. М. ВАНІЦКІ, старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі Б. У. ПАУЛЁНАК, віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР К. К. КРАПІВА [Атраховіч], сакратар Салігорскага прамысловага парткома А. Е. ШЛЫКАЎ.

З дакладам «Аб мерах па забеспячэнню жывёлы кармамі ў наступную зімоўку» выступіў сакратар ЦК КПБ, старшыня бюро ЦК КПБ па кіраўніцтву сельскай гаспадаркай Ф. А. СУРГАНАЎ.

У спрэчках па дакладу выступілі першы сакратар Мінскага сельскага абкома КПБ Д. В. ЦЯБУТ, першы сакратар Магілёўскага сельскага абкома КПБ К. В. МАЦЮШЭЎСКІ, старшыня Гомельскага сельскага аблвыканкома М. А. КЛІМЕНКА, першы сакратар Віцебскага сельскага абкома КПБ С. А. ПІЛАТОВІЧ, старшыня Брэсцкага сельскага аблвыканкома В. К. ЛУЦКІН, старшыня Беларускага аб'яднання «Белсельгастэхніка» Л. І. ХІТРУН, старшыня Гродзенскага сельскага аблвыканкома Н. П. МАЛОЧКА, сакратар парткома Жлобінскага вытворчага калгасна-саўгаснага ўпраўлення М. К. КУЛАГІН, начальнік Чэрвеньскага вытворчага калгасна-саўгаснага ўпраўлення Н. В. БЯЛЯСАЎ, першы намеснік старшыні Савета Міністраў БССР, міністр вытворчасці і нарыхтовак сельгаспрадуктаў БССР У. Е. ЛАБАНОК.

На пленуме з прамовай выступіў кандыдат у члены Прэзідыума ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Беларусі К. Т. МАЗУРАЎ.

У рабоце пленума прынялі ўдзел намеснік загадчыка ідэалагічнага аддзела ЦК КПСС Д. А. ПАЛІКАРПАЎ і інспектар сельгасаддзела ЦК КПСС Д. С. КУПЦОЎ.

Па абмеркаваных пытаннях прыняты пастановы.

АД САВЕТА МІНІСТРАЎ СССР

Савет Міністраў СССР з глыбокім жалем паведамляе, што 29 ліпеня 1964 года раптоўна памерла слаўная дачка польскага народа, выдатная савецкая пісьменніца і грамадскі дзеяч, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, лаўрэат Дзяржаўных прэмій **Васілеўская Ванда Львоўна.**

Савет Міністраў СССР.

СЁННЯ Ў ГАЗЕЦЕ

Перад вамі здымак, зроблены нашым фотакарэспандэнтам Ул. Крукам у Мінску на будаўніцтве мікрараёна «Зялёны Луг». Гэта будзе, бадай, адзін з самых прыгожых і добраўпарадкаваных мікрараёнаў сталіцы рэспублікі. Ён расце на былой пустцы за горадам і аддзелены ад мікрараёна па Волгаградскай амаль кіламетровай зялёнай зонай. Забудова яго вольная, не звязаная з прамавугольнай сеткай магістральных вуліц. Дамы будуюцца з буйных стандартных панеляў. Яны разнастайныя па аддзелцы, колеру, колькасці секцый.

Новы мікрараён пазбаўлены манатоннасці і аднастайнасці, уласцівых першым падобным забудовам у горадзе.

Дом, будаўніцтва якога адлюстравана на здымку, будзе мець 9 паверхаў і 64 кватэры. На першым паверсе размесціцца прадуктовы магазін. Будуе дом комплексная брыгада, якая змагаецца за званне брыгады камуністычнай працы. Узначальвае гэты калектыў Валянцін Галіеўскі. Направа і налева ад гэтага прыгажуна неўзабаве вырастуць яшчэ два жылыя дамы.

Новы мікрараён узнімаецца і ў Магілёве. Пра гэта вы знойдзеце адпаведную інфармацыю ў сённяшняй нашай старонцы.

Пра настойлівыя творчыя пошукі архітэктараў і будаўнікоў—эксперыментатараў расказвае ў сваім артыкуле кіраўнік архітэктурна-канструктарскай майстэрні эксперыментальнага праектавання Белдзяржпраекта Юрый Шпіт.

Журналіст А. Браілоўскі расказвае пра архітэктара Л. Усаву.

На старонцы змешчаны таксама інфармацыя аб зялёным будаўніцтве ў Гомелі, кансультацыя аб прынцыпах абсталявання сучаснай кватэры, гумарыстычныя малюнкі.

АРХІТЭКТУРНАЯ СТАРОНКА

ПЕРАКЛІЧКА СЕЛЬСКІХ КЛУБАЎ

У ДОБРАЙ СПРАВЫ — ЛЁГКІЯ КРЫЛЫ

Віктар КАНДЫБОВІЧ,
загадчык Нясвіжскага раённага аддзела культуры

△

У нашым раёне многа сапраўдных культармейцаў, ініцыятыўных, па-добраму неспакойных работнікаў. І мы імкнёмся так будаваць сваю работу, каб ніколі не гасла іх ініцыятыва. Збіраем нарады, праводзім семінары, на якіх заўсёды гаворка ідзе аб новых формах і метадах работы культасветустаноў. Часта ў гэтай творчай размове нараджаюцца цікавыя прапановы. Мы нават правялі спецыяльную творчую канферэнцыю работнікаў культуры раёна, якую прысвяцілі пошукам новага. На ёй, у прыватнасці, нарадзілася прапанова — стварыць вытворчыя агітмастацкія брыгады.

Першая такая брыгада была створана пры Ліскаўскім сельскім Доме культуры. У склад яе ўвайшлі лепшыя людзі калгаса «Савецкая Беларусь»: даярка Ірына Лентнер, брыгадзір паляводчай брыгады Міхаіл Ануфрэйчык, механізатар Уладзімір Ганчарык, аграном Васіль Бур'як і іншыя. Разам з удзельнікамі мастацкай самадзейнасці яны выязджалі ў адстаючыя калгасы «Камунар», «Праўда», «Чырвоны партызан», знаёміліся са справамі сваіх суседзяў, раілі ім, як лепш наладзіць работу на тым ці іншым участку, дзяліліся вопытам. А самадзейныя артысты на аснове мясцовых фактаў складалі частушкі, сатырычныя куплеты. Канцэрт атрымаўся жывы, вясёлы і цікавы.

Нас акрылілі водгукі гледачоў.

— Вельмі добра, што работнікі культуры прыдумалі такую дзейсную форму прапаганды перадавога вопыту, — сказаў нам старшыня калгаса «Праўда» Васіль Апанасавіч Смаршчок.

— Патрэбную справу робяць удзельнікі брыгады. Прыязджайце да нас часцей, — гаворыць старшыня калгаса «Чырвоны партызан» Мікалай Аляксеевіч Вішнякоў.

Сёння ў нашым раёне працуюць чатыры вытворчыя агітацыйна-мастацкія брыгады. Ствараем яшчэ тры — пры Высока-Ліпскай сельскай бібліятэцы, Карцавіцкім сельскім клубе, Сноўскім Доме культуры.

У дні ўборкі ўраджаю нашы работнікі культуры не сядзяць доўга ў клубах, бібліятэках. Іх месца сёння ў полі, дзе людзі працуюць ад цямна да цямна. Нашы культармейцы прыносяць хлебаробам свежыя газеты, праводзяць гутаркі, выпускаюць баявые лісткі, у якіх знаходзіць шырокае адлюстраванне спаборніцтва калгаснікаў на ўборцы ўраджаю. Нядаўна Дамасткана віцкая сельская бібліятэка выпусціла вусны часопіс на тэму «Гаспадары ўраджаю — калгаснікі», а Сіняўскі сельскі Дом культуры правёў Дзень брыгады, на якім ішла вялікая гаворка аб тэрмінах і якасці ўборкі збожжавых. Агітбрыгада гэтага Дома культуры наладзіла некалькі канцэртаў для тых, хто сёння працуе на ўборцы ўраджаю.

І ў нашым раёне, як і ў іншых, шырока праводзяцца вечары жывёлаводаў, паляводаў і механізатараў, вечары ўшанавання лепшых людзей вёскі. Я пераканаўся, што падобныя мерапрыемствы натхняюць працаўнікоў калгасаў і саўгасаў. Ды і аўтарытэт установы культуры пры гэтым намнога павышаецца.

Мы імкнёмся, каб гэтыя вечары не нагадвалі сумныя сходы. Цікавы вечар ушанавання лепшай сям'і правёў Казловіцкі сельскі клуб у калгасе «Дружба». 65 гадоў калгаснику Канстанціну Іосіфавічу Яніслаўскаму, а ён дзень у дзень выходзіць на работу. Не адстаюць ад Канстанціна Іосіфавіча і члены яго сям'і: жонка Вольга Іванаўна і дачка Ірына. Вось іх і віншавалі. У той вечар у клубе сабралася паўнютка народу. Цёплыя словы пра лепшую калгасную сям'ю гаварылі калгаснікі, кіраўнікі гаспадаркі, піянеры мясцовай школы. Яніслаўскім падносілі падарункі. Вечар закончылі вялікім канцэртам — выконвалі песні, якія любіць гэтая працавітая сям'я.

Мяне заўсёды непакоіць, як вытрымаць у нашых работнікаў культуры імкненне працаваць на поўную сілу, каб яны не фармальна выконвалі нашы інструкцыі і загады, а абавязкова ўкладвалі ў работу і сваю творчую ініцыятыву.

Ужо чатыры гады працуе ў раёне Тамара Кісель — загадчыца Мервінскай сельскай бібліятэкі. Прыйшла яна да нас нясмелай сарамлівай дзяўчынкай. А сёння яна намеснік сакратара камітэта камсамольскай арганізацыі калгаса «Шлях да камунізма», зімою кіруе палітгурткам моладзі. Тамара вучыцца завочна на бібліятэчным факультэце педінстытута. Свае непасрэдныя абавязкі прапагандыста кнігі дзяўчына выконвае надзвычай добрасумленна. Гэта па яе ініцыятыве на фермах калгаса створаны галіновыя бібліятэкі-перасоўкі. Што гэта такое? Звычайна бібліятэчкі маюць літаратуру па розных галінах ведаў, у тым ліку і мастацкую. А Тамара камплектуе перасоўкі спецыяльна для даярак, свінарак, механізатараў. І што цікава — літаратура гэтая карыстаецца ў чытачоў нязменным поспехам. Як агітатар Тамара шмат увагі аддае прапагандзе перадавога вопыту, і кніга тут — найлепшы спадарожнік.

Бібліятэкарка — арганізатар спаборніцтва паміж трыма фермамі калгаса. Як даведацца, хто лепш працуе? Можна, вядома, узяць зводку надояў малака, параўнаць лічбы і атрымаць гатовы вывад. А Тамара вырашыла спачатку правесці канферэнцыю чытачоў. На ёй абмяркоўвалі брашуры аб перадавым вопыце даярак. Бібліятэкарка непрыкметна скіравала ўвагу даярак на пытанні догляду жывёлы, загаварылі і пра тлустасць малака, надой і г. д. Пасля гэтай канферэнцыі лягчэй было вызначыць пераможцу ў спаборніцтве. У добрай справы — лёгкія крылы. Сёння ў раёне створана ўжо больш 20 галіновых бібліятэк-перасовак у паляводчых брыгадах, аддзяленнях саўгасаў і чырвоных кутках жывёлагадоўчых ферм. Бібліятэчкамі гэтымі ў большасці сваёй кіруюць энтузіясты — актыўныя прапагандысты перадавога вопыту.

Любая навінка знаходзіць у нас шырокую падтрымку. Пасля лютаўскага Пленума ЦК КПСС ва ўстановах культуры пачалі стварацца аграхімкуткі. Спачатку іх было мала, а сёння ўжо ў 71 сельскім асяродку культуры раёна з 76 ёсць куткі і кабінеты прапаганды аграхімічных ведаў. Цяжка сказаць, які з іх лепшы, бо многія маюць глебавыя карты сваіх калгасаў і саўгасаў, ледзь не ў кожным сабраны ўзоры мінеральных угнаенняў і мясцовых глеб, наглядныя дапаможнікі і літаратура па пытаннях выкарыстання ўгнаенняў і хімічных сродкаў абароны раслін.

Сабраныя матэрыялы памагаюць прапагандаваць аграхімічныя веды сярод калгаснікаў. Калі, скажам, некалькі год назад работніку культуры даводзілася прыкладаць нямала намаганняў, каб працаўнікі вёскі чыталі сельскагаспадарчую літаратуру, дык сёлета многія калгаснікі самі прыходзяць у бібліятэкі і патрабуюць гэтыя кнігі, бо на вопыце пераканаліся, што там, дзе дружаць з навукай, і ўраджаі атрымліваюць высокія, і справы ў жывёлагадоўлі ідуць значна лепш.

Мне хацелася б нагадаць нашу вялікую энтузіястку на ніве культуры Кацярыну Філімонаўну Здрок. Шаснаццаць гадоў загадвае яна Межнаслабадской бібліятэкай, ведае тут кожнага жыхара і яе добра ведаюць ва ўсёй ваколіцы. Спецыялісты калгаса памаглі правесці цыкл лекцый на тэму: «Новае, перадавое—у вытворчасць». Цыкл гэтых лекцый пачаўся абмеркаваннем артыкула старшыні калгаса імя XXI з'езда КПСС Пухавіцкага вытворчага ўпраўлення Героя Сацыялістычнай Працы Т. Жыгалка. Пасля кожнай лекцыі Кацярына Філімонаўна робіць бібліяграфічныя агляды новай літаратуры. Часцей за ўсё яны бываюць на тэму — «Майстэрства заваёўваецца ў працы». З намечанага цыкла прачытана ўжо больш 10 лекцый.

Гонар бібліятэкі — куток перадавога вопыту, які калгаснікі называюць універсітэтам сельскагаспадарчых ведаў. Бібліятэкарка сабрала тут багаты раздзел літаратуры па пытаннях хіміі ў сельскай гаспадарцы і перадавога вопыту. Прывяду толькі некаторыя назвы тэматычных выставак літаратуры: «Вялікая хімія крочыць на палі», «Інтэнсіфікацыя сельскай гаспадаркі — галоўны напрамак», «Дасягненні перадавікоў — усім калгаснікам». А вось плакаты, якія за апошні час выпусціла бібліятэка: «Наш калгас можа стаць перадавым», «Маякі клічуць наперад». У асобным сшытку сабраны рэкамендацыйныя спісы літаратуры па хімізацыі палёў, а ў спецыяльных папках «Бярыце прыклад з лепшых гаспадарак Нясвіжчыны» і «Парады спецыялістам» сабраны выразкі газетных матэрыялаў. Прыгожа афармлены альбом «Кніга працоўнай славы», у якой змешчаны фота лепшых людзей калгаса. Пад кожным фота чытаеш кароткі расказ аб працоўным подзвігу героя.

Кацярына Філімонаўна шмат увагі аддае прапагандзе сельскагаспадарчай літаратуры. Ужо сёлета за паўгода яна выдала чытачам больш за 150 экземпляраў кніг па сельскай гаспадарцы.

Было б няправільна лічыць, што толькі названыя мною ўстановы культуры займаюцца прапагандай сельскагаспадарчых ведаў і перадавога вопыту. Кожны наш клуб і бібліятэка, лепш ці горш, але займаецца гэтай справай. А каб гэтыя пытанні былі цэнтральнымі ў нашай рабоце, мы распачалі эстафету, якую назвалі «Галоўнае ў гаспадарцы — укараненне навукі і перадавога вопыту». З клуба ў клуб, ад бібліятэкі да бібліятэкі ідзе наша эстафета. У яе дзённік занатоўваюцца новыя і цікавыя мерапрыемствы, што праводзяць сёння нашы ўстановы культуры, чым памагаюць культармейцы калгасам і саўгасам раёна.

Шырокі дыяпазон у рабоце нашых устаноў культуры. Біццё жывога пульсу ўсёй краіны і роднага калгаса адчуваецца ў іх кожнай праведзенай справе і задуме.

ЖНІВО

І вось надышла яна — самая паэтычная і самая адказная пара ў працы, у жыцці хлебароба...

Важкі колас схіліўся да зямлі, казытнуў вусам суседа побач, шапнуўшы аб нечым, і вось ужо пайшло-пабегла нястрымнае шалясценне па ўсім палетку, да самага краю і дасягнула вёскі радаснай пагалоскай: збажына просіцца ў засек.

Час жніва! Як многа нясеш ты хлебаробу: бясконцы клопат напружаных дзён, ціхую спакойную стому ўначы з недаспанымі снамі на золку, маўклівую святочную радасць у душы.

Дачакаўся шчаснай хвіліны і механізатар саўгаса «Заруба», што на Аршаншчыне, Аляксандр Пімеавіч Майсеў. Лафетнай жняркай ён абавязаўся зжаць сёлета не менш 200 гектараў збажыны.

Фота **Г. УСЛАМАВА** (БЕЛТА).

ДНІ ПОЛЬСКАЙ КУЛЬТУРЫ

СУСЕДЗІ І БРАТЫ

РАДАСНЫЯ СУСТРЭЧЫ

Дні польскай культуры ў Беларусі, прысвечаныя 20-годдзю Народнай Польшчы, закончыліся.

На прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах рэспублікі праходзілі хвалюючыя сустрэчы з членамі дэлегацыі Таварыства польска-савецкай дружбы. Адбыліся шматлікія вечары савецка-польскай дружбы, а ў Гродзенскай і Брэсцкай абласцях — масавыя мітынгі працоўных пагранічных раёнаў Польшчы і Беларусі, кастры дружбы савецкіх піянераў і польскіх харцараў.

Аб дасягненнях працоўных Польшчы ў будаўніцтве сацыялізма расказалі ў сваіх выступленнях тысячы лектараў і дакладчыкаў, шматлікія фотавыстаўкі і стэнды, матэрыялы газет, радыё і тэлебачання.

Узнагароджанне вялікай групы беларускіх партызан польскімі ордэнамі і медалямі з'явілася не толькі высокай ацэнкай ратных подзвігаў і ўкладу беларускага народа ў агульную справу разгрому нямецкага фашызму, але і яшчэ больш сцементавала дружбу польскага і савецкага народаў, змацаваную пралітай крывёй у сумеснай барацьбе супраць агульнага ворага.

Беларускі народ праяўляе жывую цікавасць да культуры брацкага польскага народа. Яшчэ адно пацвярджэнне гэта знайшло і ў той увазе, якая была праяўлена да польскіх фільмаў, выставак графікі і кніг нашых сяброў, літаратурных і музычных вечароў.

Толькі на канцэртах ансамбля «Шлёнск», дадзеных у Мінску, пабывала звыш чатырох тысяч гледачоў. З вялікім поспехам прайшлі выступленні «Шлёнска» таксама ў Салігорску, Слуцку і іншых гарадах.

У мінскім кінатэатры «Мір» праходзіў фестываль польскіх фільмаў. За некалькі дзён іх праглядзела каля 36 тысяч гледачоў.

Дні польскай культуры ў Беларусі паслужылі азнаямленню самай шырокай грамадскасці з дасягненнямі брацкай краіны ва ўсіх галінах жыцця і, у прыватнасці, з яе духоўнымі скарбамі. Сардэчныя сустрэчы на беларускай зямлі будуць садзейнічаць далейшаму ўмацаванню братняй дружбы паміж польскім і савецкім народамі.

БЕЛТА.

НАВУКОВАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

Адбылося аб'яднанае пасяджэнне навуковых саветаў Інстытута гісторыі АН БССР і Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, прысвечанае 20-годдзю Народнай Польшчы.

Пасяджэнне адкрыў акадэмік сакратар аддзялення грамадскіх навук АН БССР прафесар Ц. Гарбуноў.

Даклад аб 20-годдзі Польскай Народнай Рэспублікі і яе поспехах у сацыялістычным будаўніцтве зрабіў член-карэспандэнт АН БССР прафесар І. Краўчанка. Кандыдат гістарычных навук В. Талстой расказаў аб развіцці культурных сувязей паміж Беларуссю і Польшчай.

На аб'яднаным пасяджэнні выступілі таксама член-карэспандэнт АН БССР доктар гістарычных навук Н. Каменская, навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ М. Арэхва, кандыдат гістарычных навук А. Хацкевіч. Яны гаварылі пра развіццё беларуска-польскіх навуковых і культурных сувязей удзел польскіх патрыётаў у партызанскім руху на Беларусі.

З вялікай цікавасцю былі праслуханы выступленні гасцей. Паведамленні зрабілі дацэнт кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта Аляксандр Баршчэўскі і супрацоўнік дэпартамента друку Міністэрства культуры і мастацтва ПНР Ізабэла Бенгам.

ПРЫЗЫ ПРЫБЫЛІ З ВАРШАВЫ

Беларускае радыё і тэлебачанне і Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязей з зарубежнымі краінамі правялі радыёвікторыну «Наш сябар — Польшча». Адказы на пытанні прыслалі больш 800 чалавек.

У памяшканні Таварыства дружбы адбылося ўрачыстае ўручэнне прызоў пераможцам віктарыны.

На пасяджэнне журы прыйшлі польскія госці, з'ехаліся радыёслухачы і тэлегледачы з усіх канцоў рэспублікі.

Першы прыз — турысцкая путёўка ў Польшчу — уручаецца інжынеру Генадзю Дудкіну. Ён прыслаў найбольш змястоўныя адказы, якія сведчаць аб тым, што мінчанін добра ведае жыццё братняй краіны, выдатна знаёмы з яе гісторыяй і культурай.

Другі прыз — карціна польскага мастака — таксама прысуджаецца мінчаніну — старшаму майстру Андрэю Барсуку.

Польскія народныя ўмельцы прыслалі ў Мінск вазу, зробленую з каменнага вугалю. Гэта ваза — трэці прыз. Ён прысуджаецца віцебскаму настаўніку Льву Цітову.

Ваеннаслужачы Леанід Міранові вось ужо дзесяць гадоў збірае бібліятэчку польскіх кніг і калекцыю марак Польскай Народнай Рэспублікі. Леаніду Міранові, у ліку іншых пераможцаў віктарыны, уручаецца камплект грампласцінак з запісамі польскай музыкі. Сярод прызоў таксама польскія кнігі, альбомы, мастацкія вырабы.

Пераможцаў віктарыны вітаў дэпутат сейма, кіраўнік турысцкай дэлегацыі ПНР Ян Рызнар.

Н. МАЛЮК.

З ТВОРАЎ ШАПЭНА, ВЯНЯЎСКАГА, МАНЮШКІ

Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР падрыхтаваў праграму з польскай музыкі. З ёю ён выступіў 28 ліпеня ў канцэртнай зале філармоніі. Выконваліся сімфанічная паэма Карловіча «Станіслаў і Анна», канцэрт № 2 для фартэпіяна з аркестрам Шапэна. У праграму таксама ўваходзілі «Маленькая сюіта» Людаслаўскага, Канцэрт № 2 для скрыпкі з аркестрам Вяняўскага, урыўкі з твораў Манюшкі.

Дырыжыраваў аркестрам Віталій Катаеў. Салістамі выступілі дыпламант Рэспубліканскага конкурсу Наталля Цёмкіна (фартэпіяна) і Георгій Клачко (скрыпка).

ЯК СВЯТА ДРУЖБЫ

Дваццаць дзён працягваліся ў Расійскай Федэрацыі Дні беларускай літаратуры. Поўныя хвалюючых, незабыўных сустрэч, яны выліліся ў свята дружбы братніх літаратур, братніх народаў.

Наш карэспандэнт звярнуўся да ўдзельніка Дзён беларускай літаратуры Пятра Фёдаравіча Глебкі з просьбай адказаць на некалькі пытанняў.

— Якія Вашы асабістыя ўражанні ад падарожжа ў братнюю Расію?

— Самыя светлыя, самыя лепшыя. Прымалі нас шчыра, горача, з сапраўды рускай гасціннасцю. Варта нам было толькі ступіць на смаленскую зямлю і прыняць першы традыцыйны дар—хлеб-соль, як мы ўжо адчулі атмасферу дружбы і сардэчнасці. Гэтае адчуванне не пакідала нас ні на мінуту, падмацоўвалася новымі сустрэчамі і ўражаннямі. Не магу не адзначыць такую акалічнасць — сустракалі нас, як старых знаёмых, не толькі нашы рускія калегі, а і чытачы, шырокія колы чытачоў —як гарадскіх, так і вясковых. З кім бы мы ні гутарылі—з рабочымі ці маракамі, будаўнікамі ці калгаснікамі, студэнтамі ці інжынерамі—мы заўсёды бачылі самыя шчырыя праяўленні цікавасці да Беларусі, да жыцця яе народа, гордасці за яе подзвіг у гады мінулай вайны. Нашы выступленні праходзілі ў той знамянальны час, калі краіна толькі што адзначыла слаўную гадавіну вызвалення Беларусі, і, натуральна, у нас пыталіся пра слаўных герояў-партызан, пра вядомых усёй краіне партызанскіх кіраўнікоў. Успамінаецца ў гэтай сувязі такі эпізод. Будучы ў Калінінскай вобласці, мы наведалі горад Канакова. Пабывалі, у прыватнасці, на яго знакамітым фаянсавым заводзе. Мы чыталі яго майстрам свае творы, расказвалі пра планы. Завязваліся ажыўленыя гутаркі. Нам задавалі многа пытанняў. Зайшла размова і пра дваццацігоддзе вызвалення Беларусі. І нам расказалі, што адна з воінскіх часцей, якія бралі штурмам магілёўскі ўмацаваны раён, удзельнічалі ў баях за Мінск, Ліду і Гродна, была сфарміравана з рабочых «Пралетаркі» і другіх прадпрыемстваў Калініншчыны, у тым ліку рабочых Канакоўскага фаянсавага завода. Такія ўспаміны надавалі, вядома, нашым сустрэчам і асаблівы сэнс і адценні асаблівай сардэчнасці і цеплыні.

— Як шырока знаёмы рускі чытач з беларускай літаратурай?

— Пра гэта мне таксама хацелася сказаць. Рускі чытач не толькі ведае Беларусь, не толькі цікавіцца жыццём нашага народа, але праяўляе вялікую цікавасць і да нашай літаратуры. Мне проста прыемна засведчыць яшчэ раз той факт, што нашу літаратуру тут ведаюць і любяць, што лепшыя творы беларускай паэзіі і прозы карыстаюцца ў рускага чытача вялікім поспехам. Перада мной ляжыць альбом, які нам падарылі работнікі Смаленскай абласной бібліятэкі. У альбоме сабраны свежыя водгукі аб творах нашых пісьменнікаў, празаікаў і паэтаў, а таксама прыведзены некалькі вельмі красамоўных лічбаў: у бібліятэках вобласці налічваецца каля 60 тысяч тамоў беларускай літаратуры, за апошнія два гады выдана чытачам больш 253 тысяч тамоў гэтых кніг. Каментарыі, як кажуць, не патрэбны.

— Наколькі плённымі былі Дні беларускай літаратуры ў сэнсе яе творчага супрацоўніцтва з літаратурай рускай, умацавання іх узаемасувязей?

— У нас было нямала сустрэч з рускімі таварышамі па пяру. І гэтыя сустрэчы былі не толькі цёплымі, але і плённымі, дзелавымі. Мы гаварылі аб нашых літаратурных справах, закранялі розныя пытанні нашага творчага супрацоўніцтва. Выказваліся канкрэтныя прапановы і думкі. Так, напрыклад, з ленінградскімі пісьменнікамі мы абмяркоўвалі іх прапанову больш шырока перакладаць і друкаваць творы беларускай літаратуры, у прыватнасці, прысвяціць адзін з бліжэйшых нумароў часопіса «Звезда» цалкам беларускай літаратуры. Дамовіліся, што ў Беларусь з гэтай мэтай выедзе ў хуткім часе група ленінградскіх пісьменнікаў.

Цікавай і дзелавой была гутарка ў рэдакцыі часопіса «Дружба народов». Рэдактар часопіса В. А. Смірноў праінфарміраваў нас аб бліжэйшых планах часопіса. Ён расказаў таксама аб усім тым новым, што павінна з'явіцца на старонках часопіса ў сувязі з набліжэннем 50-годдзя Кастрычніка. Мы выказалі свае думкі і прапановы. Максім Танк, напрыклад, выказаў прапанову—і я падтрымаў яго, — каб «Дружба народов» больш увагі аддавала «тоўстым» рэспубліканскім часопісам, рэгулярна давала агляды іх свежых нумароў. Выказалі мы свае прапановы і ў сувязі з намерам часопіса больш шырока друкаваць пераклады нацыянальнай класікі.

На таварыскай сустрэчы з маскоўскімі літаратарамі, на якой прысутнічалі кіраўнікі Саюза пісьменнікаў СССР і Саюза пісьменнікаў РСФСР, Леанід Собалеў гаварыў аб вялікай карысці такіх сустрэч, такіх кантактаў. Гэта сапраўды так. Няма большай радасці, чым радасць узаемнай увагі.

Не так часта можна сфатаграфавацца ў самым цэнтры Азіі.

Сёлета ў Добрушы была наладжана выстаўка работ самадзейнага мастака Аляксея Буранкова. Працоўныя раёна пазнаёміліся з творчасцю свайго земляка — загадчыка клуба калгаса «Новы шлях».

На гэтай цікавай выстаўцы экспанавалася каля 130 выкананых маслам эцюдаў, партрэтаў і кампазіцый з жыцця калгаснай вёскі. Цяпер частка работ самадзейнага мастака прадстаўлена на абласной мастацкай выстаўцы ў Гомелі.

Фотакарэспандэнт БЕЛТА Ч. Мезін сфатаграфаваў Аляксея Буранкова на эцюдах.

ПАТЫКА ГНЕВАЕЦЦА

Не ведаю, што скажа Анатоль Дзмітрыевіч Патыка на мяне. Магчыма, прачытаўшы гэтыя радкі, ён будзе сцвярджаць, што, вёўшы з ім гаворку, я быў нецвярозы, што я неогул заўсёды бываю п'яны, нават кнігі пішу ў нецвярозым стане. Хто яго ведае...

А пакуль ён сядзіць перад маім рабочым сталом. На твары яго ліслівая, саладжавая ўсмешка, якая быццам гаворыць: бачыце, які я добранькі, я ж кураняці не пакрыўджу; я—само ўвасабленне ветлівасці, культурнасці, адукаванасці, добрай абыходлівасці з людзьмі. На штрыфелі Патыкавага пінжака пабліскваe ромбік, які носяць людзі з вышэйшай адукацыяй. І ромбік гэты таксама быццам гаворыць, што яго гаспадар не абы-хто, а чалавек з шырокім кругаглядам жыцця, з добрымі манерамі і густам, словам — інтэлігент.

Гэты знешні выгляд чалавека, відаць, зрабіў бы на мяне адпаведнае ўражанне, калі б не была свежая яшчэ ў памяці тэлефонная размова, якая адбылася паміж мною і тав. Патыкам на другі дзень пасля надрукавання ў газеце артыкула А. Сурскага «Тайны Гомельскага музея». Паміж гомельскай і мінскай тэлефоннымі трубкамі ляжала адлегласць у некалькі сот кіламетраў. А ў маёй тэлефоннай трубцы аж гудзела мембрана ад гневу і абурэння: газета зняважыла, пакрыўдзіла, больш таго, знеславіла сумленнага, чыстага да глыбіні душы чалавека, кіруючага таварыша, члена Саюза журналістаў Патыку... Патыка валіў на ўсіх работнікаў музея, што гэта яны падбілі журналіста Сурскага напісаць на яго пасквіль, больш таго, яны спецыяльна падпаілі, як ён сказаў, пісаку, каб той глядзеў на ўсё асалавелымі вачыма і бачыў у такім святле, у якім патрэбна ім, Патыкавым нядобразычліўцам — сакратару партарганізацыі Агееву, мастакам Кузьмічову і Пакаташкіну і ўсім навуковым і ненавуковым супрацоўнікам музея.

— А тон які абразлівы, хіба вы не адчуваеце!—гудзела мембрана. — Такім тонам можна пісаць толькі пра ворагаў...

Здаючы артыкул Сурскага ў набор, я не заўважыў абразлівага тону. Карэспандэнцыя, як кажуць, дзелавая, доказная, крытыкуе тое, чаго нельга не крытыкаваць, маючы намер, каб музей працаваў лепш, каб людзі, наведваючы яго, знаёмячыся з яго экспанатамі, праціналіся павагай да мінулага свайго краю, радаваліся за яго сённяшні дзень, за яго людзей.

На ўсякі выпадак я ўзяўся перачытаць артыкул: хто яго ведае, можа і сапраўды якая абраза праскочыла? Але і пры гэтым чытанні ён застаўся пераканаўчым, добразычлівым.

— Дзе ж тая абраза?—хацелася запытаць мне ў тав. Патыкі, але пасля паўгадзіннай тэлефоннай размовы, вядома, за дзяржаўны кошт, трубка была пакладзена. Так я і не выказаў свайго перакананння тав. Патыку.

Падумалася, што чалавек званіў і абураўся крытыкай работы ўстановы, якую ён узначальвае, пад свежым уражаннем надрукаванага, што ён з цягам часу астыне і зробіць цвярозыя і правільныя вывады, якія пойдуць на карысць і яму самому, і калектыву, якім ён кіруе. Вядома, мала, ды бадай што і няма такіх людзей, якія б, разняўшы рукі, абдымаліся з крытыкай, як з любай жанчынай. Верылася, што тав. Патыка як кіраўнік такой важнай установы, як камуніст, астыўшы пасля першага ўзрушэння, возьмецца за ліквідацыю недахопаў, адзначаных у карэспандэнцыі.

Але Патыка, як кажуць, не з такога дзесятка. Патыка гнеўны, Патыка ваяўнічы праціўнік крытыкі. Ён лёгка не здаецца, хоць у тым, што ён сцвярджае, што ён адмаўляе, ні каліва праўды, ні крупінкі элементарнай логікі. Што гэта так, пацвердзіла яго пісьмо на імя галоўнага рэдактара газеты. Патыка стаў у ваяўнічую позу і крычыць як не на ўвесь свет: «Нізкі культурны ўзровень аўтара дазваляе заяўляць «аб бесталковых указаннях дырэктара» і не прыводзіць у пацвярджэнне ніводнага з іх». І далей: «Аўтара артыкула Сурскага я бачыў у музеі 5—10 мінут. За гэтыя 5—10 мінут ён паспеў толькі адрэкамендавацца і з тае прычыны, што быў у нецвярозым стане (прыехаў, маўляў, да свякоў), ён заявіў, што прыйдзе заўтра. Больш нічога аб рабоце музея з ім не размаўляў». Апошні сказ водпаведзі Патыкі падкрэслены.

Тав. Патыка, відаць, вырашыў, калі біць аўтара, дык біць з пляча, на ўвесь мах рукі. І напісаў не толькі ў рэдакцыю, але і сакратару партарганізацыі Беларускага політэхнічнага інстытута, дзе А. Сурскі, наш няштатны карэспандэнт, працуе выкладчыкам эстэтыкі на кафедры філасофіі, у праўленне Саюза журналістаў БССР. Заяву на імя сакратара партарганізацыі хочацца прывесці цалкам, паколькі яна добра характарызуе Патыку як пасквілянта, паклёпніка. Вось яна: «Прашу прыцягнуць да адказнасці за брахню і паклёп Вашага нам. рэктара інстытута Сурскага, які, будучы ў г. Гомелі, з'явіўся да мяне ў нецвярозым стане. Пасля яго 5—10-мінутнага «наведвання» ў газеце «Літаратура і мастацтва» № 49 ад 19 чэрвеня 1964 года паявілася паклёпніцкая заметка». І прыпісана далей: «Не пасылайце больш п'яніцу і паклёпніка, некампетэнтнага ў музеязнаўстве і мастацтве ў Гомельскі музей».

Тут што ні слова, то паклёп на чалавека, які сказаў хоць трошкі праўды ў вочы. Па-першае, Сурскі ніколі не выдаваў сябе за «нам. рэктара», па-другое, Патыку, як чалавеку, які меў справу з вышэйшай навучальнай установай, трэба было б ведаць, што ў інстытутах і пасад такіх няма—«нам. рэктара». Ёсць прарэктар. Па-трэцяе, чалавека, некампетэнтнага «ў музеязнаўстве і мастацтве», наўрад ці ўзялі б у інстытут чытаць лекцыі па эстэтыцы.

Ды што, зрэшты, з Вамі палемізаваць, тав. Патыка. Давайце паглядзім на Вас вачыма супрацоўнікаў падначаленай Вам установы, ці такі ўжо Вы «кампетэнтны» ва ўсім, у тым ліку і ў «музеязнаўстве». Перада мною ляжыць пратакол адкрытага партыйнага сходу пярвічнай партарганізацыі Гомельскага краязнаўчага музея ад 21 ліпеня 1964 года. Сход, на якім вы павінны былі быць як камуніст, як кіраўнік установы, як чалавек, пра якога ішла там гаворка, але Вы не палічылі патрэбным быць на ім і ўжо адным гэтым нанеслі знявагу цэламу калектыву. Вы, ведаючы, што будзе такі сход, знарок у гэты дзень паехалі ў Мінск—«шукаць праўду». У той момант, як адбываўся партыйны сход, Вы сядзелі перад маім сталом і, лісліва ўсміхаючыся, паклёпнічалі на супрацоўнікаў музея — на сакратара партарганізацыі тав. Агеева, на мастакоў Кузьмічова і Пакаташкіна, на ўсіх, на каго Вам выгадна было паклёпнічаць. Вы, напрыклад, сцвярджалі, што мастак Пакаташкін—чыстай вады абстракцыяніст, што Агееў выпадкова носіць партыйны білет у кішэні і г. д.

А калі б Вы былі на сходзе, Вы б з першых вуснаў сваіх супрацоўнікаў пачулі—і ад тав. Анісімава, і ад тав. Гатоўкіна, і ад тав. Каранеўскай і ад усіх, хто выступаў на сходзе,—што Вы не можаце кіраваць музеем, бо на вецер пускаеце дзяржаўныя грошы, не лічыцеся ні з чыёй думкай, што людзям з Вамі цяжка, а часам і проста немагчыма працаваць. Партыйны сход запісаў у сваім рашэнні: «Артыкул «Тайны Гомельскага музея», апублікаваны ў газеце «Літаратура і мастацтва», лічыць своечасовым, а факты, пададзеныя ў ім, правільнымі. Партыйны сход лічыць, што ў бліжэйшы час Упраўленне культуры павінна вырашыць пытанне аб кваліфікаваным кіраўніцтве музея».

Можа хто-небудзь і скажа, што не варта было займаць столькі месца на газетнай паласе расказам пра Анатоля Дзмітрыевіча Патыку, пра яго гнеў і ваяўнічасць у барацьбе супраць крытыкі. Нам здаецца, што варта, бо яшчэ ў нашым грамадстве, на жаль, трапляюцца сям-там людзі, якія, змагаючыся за гонар свайго мундзіра, гатовы абліць гразёю каго хочаш, гатовы наплёваць у душу таму, хто асмельваецца сказаць ім слова горкай праўды.

Патыка гневаецца, Патыка злуецца, Патыка абвяргае. Патыка... Хто яго ведае, на каго ён яшчэ напаклёпнічае? Можа, на аўтара гэтых радкоў?

Раман САБАЛЕНКА.

Сярод кніг

АЎТАРЫ — ПІСЬМЕННІКІ І МАСТАКІ

Аўтары зборніка «Мініяцюры і карыкатуры» — сорак трэцяй кніжкі бібліятэкі часопіса «Вожык»—пісьменнікі і мастакі, ужо вопытныя, добра вядомыя майстры і маладыя, нават «пачаткоўцы». Адразу зазначым, што сярод маладога папаўнення беларускіх сатырыкаў ёсць людзі з бясспрэчнымі здольнасцямі.

Калі чытаеш зборнік, успамінаюцца размовы аб тым, што байка як літаратурны жанр аджыла свой век, што наш час не вымагае эзопаўскай мовы: гавары пра недахопы прама, адкрыта, без намёкаў. Але хаваць байку, адмаўляць ёй у праве на існаванне, відаць, не варта. У свой час В. Бялінскі выказаў справядлівую думку аб тым, што байка будзе жыць і развівацца да таго часу, пакуль будуць з'яўляцца на гэтай ніве людзі з талентам. Прыгадваю гэтую думку таму, што такія людзі, на мой погляд, прыходзяць і зараз у беларускую літаратуру.

Вось байка Пятра Сушко «Ганарлівы сучок»:

Сталяр ля дошкі завіхаецца—
Старанна гэблік рэжа стружку,
Яна прыгожа завіваецца
Смалістаю пахучай стужкай.
Сучок задзірыста і бойка
З лязом спрачаецца дый годзе:
— Я самы мужны, самы стойкі
У мяккацелым асяроддзі.

* * *

Лязу сучок нялёгка было згрызці.
Ён цвёрды, ды няма з яго карысці.

Думаю, што гэтая байка запомніцца чытачу і можа быць узята ім на ўзбраенне.

Добра адчувае мастацкія законы байкі і Анатоль Галчанаў (байка «Верабей і Шпак»).

Да апошняга часу незаслужана была амаль што забыта ў нас форма жарту, і можна толькі вітаць, што ў зборніку «Мініяцюры і карыкатуры» змешчана шмат твораў, якія адносяцца да гэтага жанру (П. Шыбута, В. Маеўскага, Ул. Правасуда і інш.).

З дасціпнымі, народнымі па духу «Касмічнымі прыпеўкамі» выступае ў кніжцы Сяргей Дзяргай.

На жаль, смех — гэты абавязковы спадарожнік гумару і сатыры — не такі ўжо і часты госць на старонках зборніка. Вось чаму нельга згадзіцца з трафарэтнай выдавецкай характарыстыкай-анатацыяй, якая дадзена кнізе. Тут сказана: «Майстры сатыры і гумару дакладна трапляюць у цэль. Яны развенчваюць бюракратаў і хабарнікаў, дармаедаў і плеткароў, п'яніц і зазнавак—усіх (!), хто перашкаджае нашаму руху наперад». Думаю, што сказана занадта смела і беспадстаўна.

Адразу ж пасля прыведзеных радкоў анатацыі змешчаны два чатырохрадковыя творы Алеся Альшанскага. Вось першы:

На людзях ён цішэй вады,
Такі ўважлівы, пачцівы.
А дома сварыцца заўжды,
Як сыч надзьмуты — проста дзіва.
(«На людзях і дома»).

Дзе тут майстэрства сатырыка? Дзе тут дакладны стрэл у цэль? А вось твор Міхася Скрыпкі «Слава і справа»:

У адной арцелі
Хлопцы год пацелі.
Кіраўнік гнуў цвёрда
Хлопцаў на рэкорды
Для уласнай славы.
А за гэтай славай —
На капейку справы.

Думаю, што звычайныя газетныя допісы лепш «развенчваюць» непаладкі ў арцелях, ды і напісаць іх, відаць, цяжэй, чым такую «сатыру».

Агульнавядома, што кожны сапраўды мастацкі твор непаўторны. А хіба складана напісаць дзесятак аналагічных твораў, накшталт наступнага:

ЧАРАПАХА І КОНЬ

Чарапаха сказала каню:
«Ты крыху пастой, я цябе даганю».
А конь адказаў: «Калі буду стаяць,
Ты зможаш мяне й абагнаць».

А. Махнач.

Каментарыі тут наўрад ці патрэбны...

А цяпер пра мастакоў. Карыкатуры А. Волкава, В. Ціхановіча, З. Паўлоўскага, В. Ждана, А. Чуркіна і іншых не могуць не радаваць. Яны добра выкананы, зроблены рэльефна, не абцяжараны лішнімі дэталямі.

Нельга не адзначыць таксама часамі вельмі дасціпныя подпісы пад карыкатурамі. Гэта ў большасці сапраўды гумарыстычныя, завершаныя літаратурныя творы-мініяцюры. Карыкатуры і подпісы ўдала дапаўняюць адно другое.

Калі гаварыць у цэлым, сорак трэцяя кніжка бібліятэкі «Вожыка» атрымалася цікавая. І не выпадкова ў многіх кіёсках яе ўжо не знойдзеш: лепшыя творы пісьменнікаў і мастакоў прыцягнулі да яе ўвагу чытачоў.

Ул. БОГАН.

Выйшлі з друку

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Іван Шамякін. Сэрца на далоні. Раман. Мастак А. Кашкурэвіч. Тыраж 12 тыс. экз., стар. 444. Цана 1 руб. 7 кап.

Максім Танк. Глыток вады. Вершы. Мастакі Е. Лось, Г. Якубеня. Тыраж 5 тыс. экз., стар. 272. Цана 41 кап.

Анатоль Астрэйка. Слуцкі пояс. Вершы. Мастак М. Гуцієў. Прадмова М. Дастанкі і І. Канановіча. Тыраж 3 100 экз., стар. 64. Цана 7 кап.

Аляксей Кулакоўскі. Сустрэчы на ростанях. Раман. На рускай мове. Аўтарызаваны пераклад з беларускай мовы Яўг. Мазалькова. Мастак М. Савіцкі. Тыраж 100 тыс. экз., стар. 408. Цана 75 кап.

М. Алтухоў. Кваціты паркаль. Аднаактовыя п'есы. Мастак А. Плаксін. Тыраж 5 тыс. экз., стар. 32. Цана 5 кап.

Ул. Няфёд. Памылка Веры Ігнатаўны. Аднаактовая п'еса. На рускай мове. Тыраж 5 тыс. экз., стар. 24. Цана 4 кап.

Песні перамогі. Зборнік. На рускай мове. Складальнік Л. Траскоўская. Мастак Б. Забораў. Тыраж 50 тыс. экз., стар. 64. Цана 7 кап.

Іван Сіняўскі. На правым флангу. Аповесць. Для сярэдняга ўзросту. Мастак Ю. Пучынскі. Тыраж 7 тыс. экз., стар. 192. Цана 35 кап.

Мінск у творчасці мастакоў. Альбом. На рускай мове. Складальнікі Г. Карчэўскі і І. Элентух. Афармленне В. Харэўскага. Тыраж 5 тыс. экз., стар. 80. Цана 95 кап.

Дом-музей і з'езда РСДРП. Альбом. На рускай мове. Пад рэдакцыяй Н. Каменскай. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 36. Цана 29 кап.

Белавежская пушча. Альбом. Фота В. Гіпенрэйтара. Тэкст В. Вольскага. Пераклад на англійскую мову Я. Семяжона. Мастакі П. Драчоў, Б. Забораў. Тыраж 15 тыс. экз., стар. 86. Цана 2 руб. 40 кап.

І. Паньшына. Прыгожае—ў быт. Гутаркі аб мастацтве. На рускай мове. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 32. Цана 18 кап.

Піліп Пестрак. Сярод чаротаў. Апавяданні. Мастак І. Капялян. Тыраж 5 500 экз., стар. 124. Цана 12 кап.

Уладзімір Бойка. Маўклівая размова. Падарожжа ў мастацтва. Афармленне аўтара. Тыраж 8 тыс. экз., стар. 240. Цана 38 кап.

Васіль Хомчанка. Чырвоны мак. Апавяданні пра Леніна. Мастакі М. Бельскі і П. Калінін. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 32. Цана 7 кап.

Пётр Валкадаеў. Чый хлапец? Аповесць. На рускай мове. Для сярэдняга і старэйшага ўзросту. Мастак В. Ціхановіч. Тыраж 100 тысяч экз., стар. 288. Цана 48 кап.

ЯРКІ АГЕНЬЧЫК

Добры выкладчык роднай літаратуры не задавальняецца аднымі толькі ўрокамі. Ён умела працягвае выхаванне ў дзецях любві да мастацкага слова і ў пазакласных гутарках, і ў турысцкіх паходах. Адным з такіх энтузіястаў з'яўляецца завуч Валеўскай сярэдняй школы Навагрудскага раёна Уладзімір Урбановіч. Сёлета ў выдавецтве «Народная асвета» ён выпусціў кнігу «Па дарагіх мясцінах. З вопыту краязнаўчай работы па беларускай літаратуры».

У кніжцы, багата ілюстраванай, з многімі картасхемамі «літаратурных» паходаў, апісваецца вопыт выкарыстання краязнаўчага матэрыялу на ўроках беларускай літаратуры, у час турысцкіх паходаў, расказваецца пра літаратурны аддзел школьнага гісторыка-краязнаўчага музея.

Вучні павінны ведаць больш, чым даецца ў падручніку, у іх павінна ўзнікнуць жаданне болей знаць пра свой родны край, пра сваіх землякоў, — піша аўтар. У раздзеле «Пазакласная краязнаўчая работа па літаратуры» цікава расказваецца пра школьны вечар, прысвечаны пісьменнікам — ураджэнцам Гродзеншчыны, пра вечар «Польскія пісьменнікі — нашы землякі», пра конкурсы на лепшае сачыненне. Думаю, што многае з таго, што робіцца ў Валеўскай школе, варта пераймання.

М. І. Калінін гаварыў, што «нашы зямля, лясы, горы, нашы рэкі, моры з іх разнастайнасцю, прамысловыя цэнтры, калгасы, нашы школы — усё гэта можа служыць багатым матэрыялам для выхавання». І Урбановіч у сваёй кнізе (раздзел «Паходы па літаратурных мясцінах») паказвае, як многа дало валеўскім школьнікам знаёмства з сучасным жыццём тых мясцін, пра якія пісалі А. Міцкевіч, Я. Колас, П. Трус, як па-новаму загучалі для іх пасля «літаратурных» паходаў многія старонкі «Новай зямлі», вершаў М. Танка, В. Таўлая. Лепшае ж веданне гераічнай гісторыі роднага краю, традыцый яго баявой і працоўнай славы дапамагае выхаванню патрыятызму, адданасці справе партыі і народа.

Цікава будзе чытачу даведацца, як з невялічкага стэнда «Нашы слаўныя землякі» ў Валеўскай школе вырас вялікі літаратурны аддзел школьнага гісторыка-краязнаўчага музея, як была сабрана багатая калекцыя заходнебеларускіх перыядычных выданняў 20—30-х гадоў, кніг, выдадзеных суполкай «Загляне сонца і ў наша ваконца». Цікава будзе таксама даведацца, што ў музеі захоўваюцца лісты К. Крапівы, П. Броўкі, М. Танка, П. Пестрака, Я. Брыля, Е. Путрамента і іншых пісьменнікаў да членаў літаратурнага і гістарычнага гурткоў, дзённікі летніх паходаў і лепшыя вучнёўскія сачыненні...

Вельмі добра было б, каб такія музеі былі ў кожнай сярэдняй школе. Ды і чым дрэнна, калі б літаратурныя музеі былі і ў педінстытутах, ва універсітэце?..

Вядома, ёсць у кнізе і недахопы. Часам хочацца, каб напісана яна была больш паэтычна, каб больш шырокім быў погляд аўтара. Але і ў такім выглядзе, як яна ёсць, кніга «Па дарагіх мясцінах» — яркі агеньчык, які павінен паклікаць за сабой у дарогу цікавых пошукаў і знаходак многіх настаўнікаў.

І. САЛАМЕВІЧ,
аспірант БДУ імя Ул. Леніна.



Вялікія пераўтварэнні і змены, што адбыліся ў наднёманскім краі, адлюстраваны ў новай экспазіцыі «Народная гаспадарка і культура Гродзеншчыны за пасляваенныя дваццаць год». У чатырох вялікіх залах Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея экспануецца прадукцыя прадпрыемстваў і сельскай гаспадаркі вобласці. Наведвальнікі з цінавасцю знаёмяцца з макетамі новых фабрык і заводаў, кінатэатраў, школ і дашкольных дзіцячых устаноў. Шмат матэрыялаў расказвае пра росквіт народных талентаў гэтага самабытнага краю.

Фота А. ПЕРАХОДА. (БЕЛТА).

АЎТОГРАФЫ ПАЭТА

Выкладчык Мікалаеўшчынскай сярэдняй школы імя Якуба Коласа, пляменнік народнага паэта Уладзімір Міцкевіч перадаў літаратурнаму музею песняра чатыры фотакопіі вокладак кніг твораў народнага паэта з яго аўтографамі. Гэтыя кнігі былі выпушчаны выдавецтвамі Беларусі ў розны час. Якуб Колас падараваў некаторыя з іх свайму дзядзьку Ігнату Юр'евічу Міцкевічу, які пасля Айчыннай вайны быў дырэктарам Мікалаеўшчынскай школы, з надпісам: «Хоць і дзядзьку Ігнату, але чуць не брату, на памяць. Я. Колас. 13.IX.1934 г.». І яшчэ: «Дарагому Ігнату Юравічу Міцкевічу на памяць аб Вусцянскім грудку і Лявонавым лужку. Якуб Колас. 31.V.1939 г. Мінск».

Пасля Вялікай Айчыннай вайны Якуб Колас падтрымліваў сувязь з І. Ю. Міцкевічам, пісаў яму пісьмы, дапамагаў будаваць новую школу, клапаціўся аб добраўпарадкаванні роднага сяла. Тады ж паэт падараваў яму чарговую сваю кнігу з аўтографам: «Дарагому Ігнасю, спадарожніку, дзядзьку, доўгаму суседу па Свіслачы (Падбярэжжа, Вусце, Балачанка, Беразянка). На памяць. Якуб Колас. 20.I.1947 г.». (У названых мясцінах Якуб Колас адпачываў у свой час з І. Ю. Міцкевічам).

Праз год пасля гэтага Дзяржаўнае выдавецтва БССР выпусціла паэму Якуба Коласа «Рыбакова хата». І гэты твор паэтаў Міцкевічу народны пясняр. На вокладцы яго паэт напісаў: «Дарагому Ігнасю Юр'евічу Міцкевічу ад аўтара. 5.III.1948 г.».

Г. МІХАЙЛАЎ.



Аркадзь Чарнышэвіч працягвае працаваць над трэцяй і чацвёртай кнігамі рамана «Засценак Малінаўка».

Змест чацвёртай кнігі складуць падзеі трыццатых гадоў. Прапануем увазе чытача адзін з яе раздзелаў.

Калі падводы спыніліся каля вялікага трохпавярховага дома ў Слуцку, быў ужо адвячорак. На брукаванай вуліцы тонкім пластом ляжала рэдкая чорная грязь. Была першая палова сакавіка, але снег ужо сышоў, ліліся дажджы, стаяла хмурае вільготнае надвор'е. Над горадам вісеў горкі чорны дым, які ішоў сюды ад чыгуначнай станцыі. Цяжкімі воблакамі ён уздымаўся над будынкамі і павісаў у сырым халодным паветры.

Падвод было шмат. На кожнай ляжалі скрынкі, мяхі, вялізныя вузлы; сядзелі жанкі, некаторыя з малымі на руках, дзеці, дзяды і бабулі. Мужчыны, пасінелыя ад холаду, стаялі каля вазоў, як вартавыя, і чакалі, самі не ведаючы чаго.

Антось і яго брат Алесь таксама пільнавалі тыя два вазы, дзе сядзела іх маці, дзве малодшыя сястры і брат, ляжалі рэчы, якія ім дазволілі ўзяць.

Антось быў малодшы за брата на два гады, аднак на першы погляд здаваўся старэйшым. Ён быў вышэйшага росту, шырэйшы ў плячах. Вочы яго, глыбока захаваныя пад высокім ілбом, у адрозненне ад братавых, іранічна бліскалі. Ён з цікаўнасцю аглядаў людзей і яму здавалася, што ўсе яны падобны адзін на аднаго не толькі адзеннем, але і тварамі. Усе яны тапталіся каля сваіх вазоў і са страхам паглядалі то на канваіраў, то на дом, ля якога спыніліся. У позірку кожнага можна было прачытаць толькі адно: «А што ж гэта будзе, куды нас павязуць?»

Антося цікавіла не толькі гэта. Усе падзеі, якія цяпер адбываліся, ён успрымаў своеасабліва, больш індывідуальна, чым яго брат, і адначасова шырэй. Яго свідравала думка, чым закончыцца гэтая трывога, што напаткала яго жыццё ў самыя лепшыя гады— пачатак юнацтва. Колькі было надзей на шчасце, на працу, на вялікую будучыню! Здавалася, што ўсё, што хвалюе і сэрца і душу, здзейсніцца, што яно не за гарамі, а недзе блізка, поруч, і вось раптам усё гэта адсечана, як сякерай, і засталося ззаду. І не вернецца ніколі... А воддаль віднеўся жоўты будынак вакзала. Гэта адтуль уздымаўся чорны дым і даносіліся гудкі паравозаў. «І куды вядзеш мяне, невядомая дарога!»—успомніў ён раптам словы любімага пісьменніка.

Міма праходзілі цікаўныя гараджане і баязліва спыняліся, каб зірнуць на людзей, якіх некуды павязуць. У некаторых было жаданне падысці бліжэй ды распытаць: а як, а за што, а чаму, а куды? Але строгія непрыступныя канваіры сурова папярэджвалі: «Праходзь! Нечага тут!»

«Як катаржнікаў»...—з ціхім адчаем думаў Алесь. Маці ціха плакала, узіраючыся на дзяўчынак, якія бесклапотна спалі, прытуліўшыся адна да адной. Сцёпа—чатырнаццацігадовы хлопец—па ўсім відаць, быў задаволены такім далёкім і на яго думку вельмі цікавым падарожжам.

— Не плачце, мама... Каму гэта трэба?—панура сказаў Алесь.

— Не магу я, сынок.. Што з намі будзе?..

Алесь адвярнуўся і зрабіў выгляд, што папраўляе шапку.

— Ты, што, Саша, зусім духам упаў? — запытаў Антось.

— А табе весела?

— Мне зусім не весела, але і плакаць я не збіраюся.

— Дурны ты яшчэ і нічога не разумееш...

— А ты хіба разумееш, Саша?

— У тым і клопат... Каб я разумеў! Я думаю аб тым, што з намі будзе? Загінем мы, вось што я толькі разумею... І маці плача не дарэмна...

— Няўжо ж усе гэтыя людзі загінуць?

— Ты не пра людзей думай, а пра сябе... Пра бацьку падумай, дзе ён цяпер і ці ведае, што з намі робяць... Праз яго ласку.

Успамін аб бацьку балюча крануў сэрца Антося. Суровы, ганарлівы, сваявольны і непакорны чалавек быў іх бацька, але Антось паважаў яго і па-свойму любіў. Гэтая любоў яшчэ болей умацавалася пасля расстання ў Цімкавіцкай турме. Антось успомніў тыя горкія хвіліны і забыў аб усім.

— Чаму ты думаеш, што мы загінем?—запытаў ён.—Хіба мы маленькія?

— Маленькія... А што мы з табой умеем! Гной вазіць, араць ды баранаваць. Сена касіць... Сямігодкі паканчалі, а кім мы былі ў бацькі? Нічога мы з табой не ўмеем і не ведаем, бо парабкамі былі ў бацькавай гаспадарцы... Я заўсёды на яе пляваць хацеў, ты гэта ведаеш. А цяпер жыццё наваліцца на нас і... А каб быў бацька... Няхай бы яго галава балела, а не мая. Работы я не баюся.

— Не бядуй, Саша,—мякка прамовіў Антось.— Ты заўсёды такі: прапалі, загінулі... Перш за ўсё я ўпэўнены, што нас вязуць не на пагібель...

Алесь махнуў рукой і не адказаў.

Золкі сакавіцкі холад працінаў да касцей. Вечарэла. У некаторых дамах ужо запалілі святло, і вось у гэты час і быў аддадзены загад выгружацца з рэчамі і ісці ў той вялікі дом, каля якога стаяў абоз.

У адно імгненне пачалася такая таўканіна і мітусня, што нельга было зразумець, што адбываецца. Людзі кінуліся да памяшкання так імкліва, нібы там было захавана іх шчасце, і яго нехта можа перахапіць.

Чалавек у пацёртым драпавым паліто, рыжы, даўгатвары, па ўсім відаць шляхціц, куфэркам штурхануў у плечы маладога шыракаплечага мужчыну ў рыжым паўкажушку, рыжых ялавічных ботах і рыжых суконных штанах. Той азірнуўся, паклаў на зямлю свой мех і, доўга не размаўляючы, размахнуўся і даў шляхціцу важкую аплявуху. Шляхціц пахіснуўся і абедзвюма рукамі схапіўся за шчаку. Куфэрак яго паляцеў на дол.

— За што, мой пане?—прыйшоўшы ў сябе, запытаў ён.

— Не штурхайся... Гэта ты мяне трэці раз. Першы раз у калідоры, потым з лесвіцы ледзь не сапхнуў, калі я дзяцей нёс. А я табе злёгку даў, бо мы ў адну дарогу едзем, можа, суседам недзе будзеш, а каб па-сапраўднаму, то ты б разам са сваім куфэркам перакаціўся дзесяць разоў.

Антося зацікавіў гэты чалавек, яго словы і сур'ёзны тон, якім яны былі сказаны. Ён вырашыў не выпускаць яго з-пад увагі. У гэты час нехта выгукнуў:

— Два рыжыя б'юцца!

— Адзін жа не рыжы!—канстатаваў другі.

І атрымаў адказ:

— Рыжыя абодва! Адзін з морды, другі з постаці!

Пачуўся рогат і тут рыжы з морды зразумеў, што яго годнасць вельмі абразілі. Ён замахаў кулакамі, хацеў сказаць нешта значнае і злоснае, але ў яго нічога падобнага не выходзіла.

— Я, пане мой... Я табе морду паб'ю... Хам, хамут... Я, пане мой, табе гэтага не дарую. Ліха тваёй матары...

— Вялікі ты пан! Паліто дзедаўскае надзеў, дык думаеш панам стаў!

— Я табе, хамут, пакажу!.. Я... я от вазьму і заяўлю.

Іх і сапраўды развялі канваіры.

Антось наглядаў усё гэта і рагатаў ад душы, забыўшыся аб усім—і аб ссылцы, і аб бацьку, і аб тым становішчы, у якім апынуўся. Алесь зірнуў на яго і паківаў галавою.

— Эх, Антось... Тут не смяяцца трэба, а плакаць... Цяпер, нават цяпер, калі людзі не ведаюць, што іх чакае, калі ўсіх іх чорт адной вяроўкай звязаў, і то яны не могуць памірыцца.

— У тым і справа, Алесь. Таго і смешна. А гэты рыжы з постаці малайчына. Трэба даведацца, хто ён.

Алесь недаўменна зірнуў на Антося.

— Ну, брат, дзяцінства ў цябе яшчэ да чорта. Што Сцёпа, што ты—аднолькавыя. Вунь зірні.

Антось кінуў позірк на воз, дзе сядзела маці. Сцёпа, каб лепш убачыць бойку, стаў на возе і смяяўся па-дзіцячы, аж захлынаючыся.

— Будзем выгружацца і мы, дзеці,—сказала маці і злезла з воза.

Дзяўчынкі ўжо прачнуліся. Старэйшая дзесяцігадовая Ліда пачала злазіць услед за маці, малодшая Таня яшчэ сядзела на возе і соладка пазяхала пасля сну.

— Пільнуй вазы, Сцёпа,—загадаў Антось здымаючы мех з мукой,—а вы, мама, з дзецьмі ідзіце з намі.

Першы паверх дома быў ужо заняты. Братам прыйшлося падымацца на другі. Яны прайшлі па доўгім калідоры і занялі першы пусты пакой. У ім стаяла класная дошка і некалькі лавак. Хлопцы думалі, што іх размяшчаюць у школе, аднак памыліліся. Будынак належаў педтэхнікуму. Антось выбраў месца ў кутку каля акна, склаў туды мяхі і адгаразіў іх лаўкай. Браты пакінулі тут маці і сёстраў, а самі пайшлі па астатнія рэчы.

Вярнуўшыся апошні раз разам са Сцёпам, Антось убачыў на сваім месцы «рыжага з морды», які заняў іх кут. Сумесна з сынам, таксама рыжанькім, ён размяшчаў там свае рэчы.

— Вы чаму не на сваім месцы, мама?—запытаў Антось, адчуваючы, як кроў прылівае да яго твару.

— Ды вунь той,—маці паказала на рыжага,— прыйшоў сюды і павыкідаў нашы мяхі ў праход.

Антось паклаў мех на падлогу і рашуча накіраваўся да шляхцюка. Той стаяў задам да яго, сагнуўшыся над сваім дабром. Антось схапіў яго за каўнер і шматнуў так, што рыжы імгненна разагнуўся. Напалову ададраны каўнер павіс на плячах. Шляхцюк атарапела зірнуў на Антося.

— Прыбірай адсюль свае торбы!—загадаў Антось.—Ды скарэй, чуеш!

— А ты хто такі, мой пане? Малакасос тэ-ы!

Раптам ён заўважыў, што на адным баку не хапае каўняра і так, як на двары, пачаў тупаць нагамі і махаць кулакамі.

— Глядзі, Стась!.. Глядзі!.. Ён мне адзежыну сапсуў! Я от вазьму і заяўлю! Я заяўлю!— крычаў ён, наступаючы на Антося. Рыжанькі Стась убачыў сапсутую адзежыну і схапіў Антося за грудзі. Усе, хто прысутнічаў у пакоі, імгненна замоўклі. У самыя цяжкія часіны жыцця такое відовішча надзвычайна прыцягвае ўвагу людзей. У тую хвіліну яны забываюць сваё цяжкае становішча. Атрымліваецца нейкая разрадка ў думках і клопатах.

Адчуўшы руку рыжанькага на сваіх грудзях Антось забыўся аб усім на свеце. Ён схапіў яго за горла і шпурнуў у дзверы. Той паляцеў цераз увесь праход і, зачапіўшыся нагой за парог, расцягнуўся ў калідоры. Услед за ім адправіўся і бацька. Тады Антось пачаў хапаць мяхі і кідаць іх услед за гаспадарамі. Некаторыя развязаліся і з іх вывальваліся вантробы: старыя кажухі, падушкі, лахманы і іншы шляхецкі скарб. Загаласілі жанчыны, старая і маладая, і кінуліся збіраць сваё багацце.

— Займайце сваё месца,—сказаў Антось Алесю і маці, аслабаніўшы кут.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

АРХІТЭКТУРНАЯ СТАРОНКА

НАЗВА МІКРАРАЁНА—«МІР»

Ідэю мікрараёнаў ухвалілі і архітэктары, і жыхары. Задача цяпер у тым, каб больш зручна і рацыянальна планаваць жылыя масівы і размяшчаць культурна-бытавыя ўстановы, удасканальваць унутраную планіроўку кватэр і вырашаць рад іншых горада-будаўнічых праблем.

Гэтымі пытаннямі займаюцца архітэктары не толькі сталіцы, але і абласных гарадоў. У Магілёве некалькі гадоў назад быў распрацаваны першы праект мікрараёна — Магілёў-II. Кіравалі работамі галоўныя архітэктары І. Фралоў і Р. Борахаў. Яны адмовіліся ад раней прапанаваных для гэтага раёна прынцыпаў забудовы і вынеслі асноўныя магістральныя вуліцы за мяжу мікрараёна, згрупіравалі ў адзінае цэлае комплексы жылых будынкаў, якія раней былі «рассечаны» вуліцамі.

А побач з першым мікрараёнам, на другім баку мінскай шашы, ужо выраслі дамы новага жылога комплексу, які прапанавана назваць «Мір». Тут знешні сілуэт забудовы будзе больш багаты, шырэй будзе ўжывацца рознапавярховасць. Прапануецца пабудаваць некалькі шматсекцыйных дамоў на восем—дзевяць паверхаў.

Калектыў архітэктараў Магілёўскага аблпраекта цяпер працуе над вырашэннем раду пытанняў планіроўкі новага мікрараёна, прывязвае тыпавыя праекты, займаецца падборам новых, больш рацыянальных і зручных для мясцовых умоў схем жылых комплексаў. Фотакарэспандэнт зняў адзін з момантаў нарады архітэктараў. Ля макета мікрараёна (злева направа) — кіраўнік архітэктурна-планіровачнай майстэрні Д. Боранаў, галоўны архітэктар Р. Борахаў і старшы архітэктар Ул. Арлоўскі.

Фота С. АНАНКІ.

ЖЫВАЯ ДУМКА ЭКСПЕРЫМЕНТАТАРА

Юрый ШПІТ,
кіраўнік архітэктурна-канструктарскай майстэрні эксперыментальнага праектавання Белдзяржпраекта

□

І ў АРХІТЭКТУРЫ, і ў будаўніцтве сёння ўзрасло значэнне элементаў творчасці і навукі; на дапамогу дойлідам прыйшоў эксперымент. Без яго немагчыма ні паскараць тэмпы будаўніцтва, ні зніжаць яго кошт, ні паляпшаць тэхналогію, ні павышаць якасць жылля вытворчага ці любога іншага памяшкання.

Эксперыментаваць — значыць браць на сябе вялікую адказнасць, бо кожная памылка ці недагляд у праекце, «запушчаным у вытворчасць», шмат разоў паўтараецца пры ўзвядзенні будынкаў. Удасканальванне ж праекта, які стаў тыпавым, непазбежна выклікае пераастрэнку ў тэхналагічных лініях на вытворчасці, запавольвае выпуск прадукцыі, ставіць пад пагрозу зрыву выкананне планаў будаўніцтва. І не заўсёды памылкі ці недагляды, дапушчаныя ў тыпавым праекце, можна выправіць. Так, у 1962—1963 гадах Цэнтральны навукова-даследчы інстытут эксперыментальнага і тыпавога праектавання распрацаваў серыю праектаў буйнапанельных дамоў з палепшанымі кватэрамі. Невялікія паляпшэнні ў планіроўцы кватэр, якія неабходна было зрабіць, патрабавалі значнага пераабсталявання домабудаўнічых камбінатаў. Аднаго толькі металу на пераабсталяванне спатрэбілася каля 400 тон. Апроч таго, давялося б спыніць заводы на тры—чатыры месяцы. Гэта азначае, што іх гадавая магутнасць знізілася б на 25—30 працэнтаў. Таму, нягледзячы на наяўнасць палепшаных праектаў, буйнапанельныя жылыя дамы ўсё яшчэ будуюцца са старой планіроўкай.

НАД ЯКІМІ Ж асноўнымі пытаннямі б'ецца жывая думка архітэктара-эксперыментатара і будаўніка-эксперыментатара?

Возьмем, для прыкладу, жыллё. Перш за ўсё эксперыментатар шукае шляхі паляпшэння планіроўкі кватэр і павышэння іх камфартабельнасці. Зазначым, што добрыя планіроўка і камфартабельнасць азначаюць не толькі зручную пярэднюю, убудаваныя гаспадарчыя шафы, раздзельныя санвузлы, павялічаныя кухні і да т. п. Гэта яшчэ і павелічэнне колькасці пакояў пры захаванні агульнай плошчы кватэры, павышэнне якасці аддзелкі, прымяненне новых, больш гігіенічных сістэм ацяплення, вентыляцыі, асвятлення.

Далей. Падлічана, што непрадукцыйныя затраты часу, звязаныя з вядзеннем хатняй гаспадаркі асобнай сям'ёй, у сярэднім складаюць у жанчын 34 гадзіны, а ў мужчын — 15 гадзін у тыдзень. Гэта час, затрачаны на прыгатаванне ежы, мыццё бялізны, уборку кватэры, нарыхтоўку прадуктаў, дастаўку дзяцей у дзіцячы сад і г. д. Адсюль вынікае такая вялікая задача, як паляпшэнне планіроўкі цэлых кварталаў і нават мікрараёнаў. Архітэктары-эксперыментатары абавязаны стварыць такі тып жылля, дзе былі б у разумнай ступені злітыя (або як мага набліжаны адзін да аднаго) жыллё і сучасная сістэма грамадскага абслугоўвання, якая павінна быць рэнтабельнай і дазваляць сям'і адмовіцца ад індывідуальнага вядзення хатняй гаспадаркі. Дадатковы вольны час сям'я здолее выкарыстаць на адпачынак, вучобу, спорт і г. д.

Вось таму цяпер эксперыментальна правяраецца магчымасць максімальнага набліжэння да жылля грамадскіх прадпрыемстваў першай незбходнасці (сталовых, крамаў, бібліятэк, камбінатаў бытавога абслугоўвання, кафэ, кінатэатраў і да т. п.) у вялікім комплексе жылых і грамадскіх будынкаў, які ствараецца па вуліцы Талбухіна ў Мінску. І яшчэ адна важная мэта гэтага эксперымента — выкарыстоўваючы абсталяванне домабудаўнічых камбінатаў, якія выпускаюць вырабы і дэталі да пяціпавярховых буйнапанельных дамоў, праверыць магчымасць будаўніцтва дзевяціпавярховых буйнапанельных дамоў.

Дасканала будуць праверены новыя прыёмы арганізацыі грамадскага абслугоўвання насельніцтва на прыкладзе вялікага мікрараёна. Праз некалькі год у раёне Вялікай Слепні на добраўпарадкаванай тэрыторыі сярод мноства зеляніны, вакол штучных вадаёмаў вырастуць пяці-,дзевяці-,шаснаццаціпавярховыя жылыя дамы розных тыпаў. Непадалёк ад іх будуць дзіцячыя сады, яслі, школы, спартыўныя пляцоўкі, месцы для адпачынку дарослых. Новая сістэма грамадскага абслугоўвання прадугледжвае блок пярвічнага абслугоўвання на групу дамоў з насельніцтвам у дзве—тры тысячы чалавек. У гэты блок уваходзяць хлебны магазін, кафэ, бюро заказаў па дастаўцы прадуктаў на дом, камбінат бытавога абслугоўвання, аўтаматы па продажу разнастайных прадуктаў. На тры—чатыры такія групы дамоў прадугледжана стварэнне грамадскага цэнтра з гастранамічным, прамтаварным магазінамі, сталовай, універсальнай залай, дзе можна арганізаваць канцэрт, прагледзець фільм і да т. п.

Памянёныя задачы, з якіх ледзь ці не кожную можна назваць праблемай «нумар адзін», дойлідамі-эксперыментатарамі не могуць быць вырашаны без распрацоўкі новых канструкцый і будаўнічых матэрыялаў. На гэтым шляху нямала цяжкасцей. Так, у 1961—1962 гадах у мікрараёне па Волгаградскай вуліцы ў Мінску пабудаваны два эксперыментальныя шасцідзесяцікватэрныя жылыя дамы. На будаўніцтве аднаго з іх правяралася магчымасць вырабу сценавых блокаў панеляў на спецыяльным агрэгаце — «бетаніруючым камбайне». У час будаўніцтва дома і пасля яго засялення выяўлены шэраг недахопаў: нязручныя планіроўкі кватэр (праваяўся планіровачны прыём, калі ўваход ў ванны пакой быў з кухні, а спальні—завужаныя), нявырашаная праблема абапірання панеляў перакрыцця на вонкавыя сцены, што абцяжарвала мантаж дома, і да т. п. Гэтыя недахопы паставілі пад сумненне мэтазгоднасць будаўніцтва такіх дамоў.

А вось другі дом—з узбуйненых блокаў з аблегчанага аглапарытам сілітакнага бетону — пацвердзіў магчымасць скарыстання ў будаўніцтве жылля такіх блокаў. Планіроўка кватэр у ім паказала, што пры змяншэнні шырыні корпуса дома кватэры могуць мець лепшыя прапорцыі жылых пакояў; рассоўныя перагародкі дазваляюць павялічыць па жаданню жыхароў памеры агульнага пакоя за кошт іншых.

І яшчэ пра адну навінку прыемна тут паведаміць—пра новую планіроўку кватэр у буйнапанельных дамах. Для праверкі і супастаўлення новай планіроўкі са старой у мікрараёне «Зялёны Луг» будуецца дзевяностакватэрны жылы дом. Серыя праектаў такіх дамоў з палепшанымі кватэрамі была накіравана на разгляд у Маскву, у Дзяржбуд СССР. Цяпер яны рэкамендаваны для будаўніцтва ў Беларусі.

КОЖНЫ дзень перад эксперыментатарамі паўстаюць усё новыя задачы. Каб паспяхова іх вырашаць, архітэктары гуртуюцца ў творчыя калектывы. У нас у рэспубліцы лепшыя сілы праекціроўшчыкаў - эксперыментараў Белдзяржпраекта згрупаваны ў спецыяльнай майстэрні. Тут працуюць поплеч і людзі з вялікім працоўным вопытам, такія, як, напрыклад, інжынер Дзмітрый Антонавіч Міхайлоўскі, і маладыя, як архітэктары Ульянава, Цямноў, Пушкін, інжынеры Целеш, Жураўскі, Кірзнер.

Пошукі новых тыпаў жылля, канструкцый, абсталявання будынкаў, новых матэрыялаў працягваюцца. Эксперыментальнае праектаванне і будаўніцтва — цудоўная школа для нашых дойлідаў, канструктараў, інжынераў-будаўнікоў, людзей дапытлівай думкі, творчага пошуку.

ТВОРЧАСЦЬ

Юны, звонкі голас адказаў па тэлефоне:

— Слухаю... Так, я. Што ж, прыязджайце.

Паклаўшы трубку, я падумаў: «Па голасе гэта яшчэ зусім маладая жанчына. Можа я нешта пераблытаў і мне расказалі зусім пра іншага чалавека?..»

Але вось яна перада мною, Любоў Дзмітрыеўна Усава, галоўны архітэктар праектаў інстытута «Мінскпраект». Я чую той жа, што і па тэлефоне, малады голас. Але галаву жанчыны пасерабрылі час і перажытае.

— Подзвігаў у архітэктуры не раблю. Працую, як і многія іншыя. Вы кажаце—«творчасць»?.. На маю думку, кожная сумленная праца, праца ад душы—творчасць...

Вельмі лаканічная і дакладная формула. Тым больш прыемна, што чуеш яе ад чалавека вялікай і добрай прафесіі, прадстаўнікі якой упрыгожваюць зямлю на гады і на стагоддзі.

Любоў Дзмітрыеўна ўвесь час стараецца абысці адказ на пытанне, што ёю—архітэктарам з семнаццацігадовым стажам работы—створана ў Мінску.

— Нічога асаблівага.

Паступова высвятляецца, што «нічога асаблівага»—гэта будынкі політэхнічнага інстытута, абласнога камітэта партыі, Палаца піянераў, Тэатра юнага гледача, станцыі юных тэхнікаў. Кожны раз, калі мне ўдаецца літаральна «выцягнуць» чарговую дэталь яе архітэктурнай біяграфіі, яна падкрэслівае:

— Не адна. Працавала група.

Я кажу, што група—групай. Але на чале яе нехта ж стаіць. Яна адмоўна ківае галавой і зноў падкрэслівае:

— Калектыў.

Усаву завуць да тэлефона. З-за прыадчыненых дзвярэй чуваць яе голас, рэзкі і настойлівы. Яна катэгарычна патрабуе нешта фарбаваць толькі тою фарбаю, якая прадугледжана праектам. Абяцае ў чымсьці памагчы, нешта дастаць.

Вяртаецца і смяецца:

— Вось бачыце! Сучасны архітэктар—гэта не ізаляваны ад свету адзіночка, які творыць у цішыні кабінета. Даводзіцца і па будаўнічых рыштаваннях лазіць, і з прарабамі сварыцца...

Апроч таго, аказваецца, сучасны архітэктар павінен быць чалавекам вялікай эрудыцыі.

— ...Цяпер мне, напрыклад, далі заданне: кветкаводчая гаспадарка ў Баранавічах. Гару літаратуры перагартала, пакуль зразумела, што і як,— і адразу ж дадала:—Ды гэта нішто — кожнаму з нас такое выпадае...

Мы гаворым пра сучасны архітэктурны стыль. Мне цікава высветліць думку Л. Усавай па гэтым пытанні. А пазіцыя яе вельмі ясная. Так, часы грувасткіх ляпных ордэраў, статуй на дахах і да таго падобных «прыгожасцей» прамінулі. Тэндэнцыя утылітарнасці ў архітэктуры адпавядае запатрабаванням часу. Але ва ўсім трэба знаць меру:

— Іншы архітэктар так захапляецца квадратамі і прамавугольнікамі, што зусім забываецца на чалавека, які павінен жыць у гэтым свеце вострых вуглоў... Сучаснасць—не ў спрошчанасці. І не трэба кідацца з аднае крайнасці ў другую.

«Што ж сёння—«любімы канёк» архітэктара Усавай?» —думаю я і з паўгадзіны справую гэта высветліць. Пасля размова паступова пераходзіць на тэмы зялёнага будаўніцтва. І я бачу, што мая субяседніца пачынае «загарацца». Падобна, што я вось-вось атрымаю адказ на сваё пытанне. Яна гаворыць пра вялікую і цяжкую працу па азеляненню Мінска: нельга ўсе вуліцы горада абсаджваць толькі аднымі ліпамі; у скверах і на бульварах патрэбны дыяганальныя дарожкі, бо людзі часта вымушаны хадзіць па газонах, не маючы часу абыходзіць па алеях за некалькі сот метраў... Карацей кажучы, пра ўсё, што звязана з зялёнай аздобай нашай сталіцы, Л. Усава гаворыць з запалам, з веданнем справы.

— Вось, калі б нам удалося дабіцца ў гарсавеце, каб усе бульвары, скверы, сады і паркі замацавалі за пэўнымі арганізацыямі. Хаця б нагляд з іхняга боку арганізаваць!

— А каму гэта «нам», Любоў Дзмітрыеўна?

— Ды камісіі па ахове зялёных насаджэнняў. Я старшыня яе...

— Значыцца, вы дэпутат гарсавета?

— Так...

Спачатку Л. Усава некалькі разоў мімаходзь успамінае пра парк культуры імя Горкага. А затым гаворыць толькі пра яго, з захапленнем. І я даведваюся: яна—галоўны архітэктар перабудовы гэтага парку ў дзіцячы. Размешчаны ў цэнтры горада, страдаўні і ў недалёкім мінулым дужа занядбаны парк цяпер абнаўляецца. І работы там хапае.

— Усё гэта—складана. Прадпрыемствы ўдзельнічаюць у перабудове парку на грамадскіх асновах. Работы ідуць вельмі марудна. Заяваць даводзіцца. Вось, напрыклад, у самым сэрцы парку—цір ДТСААФ. Ніяк не забяруць яго адтуль... А чаго толькі мы не запраектавалі! Вялікі спартыўны комплекс, вадзяную карусель, выставачны павільён. І ведаеце што,—збіваецца яна на ўсхваляваны паўшэпт, быццам паведамляе мне вялікую тайну,—на тэрыторыі парку ёсць глыбокая артэзіянская шчыліна. Аналіз паказаў, што вада ў ёй па саставу проста чарнаморская! Пабудуем басейн, і нашы малыя, не выязджаючы з Мінска, будуць купацца ў «сапраўднай» марской вадзе...

Яна гаворыць, гаворыць. А мне раптам хочацца сказаць ёй... Тады я гэтага не зрабіў, скажу цяпер:

— Так, творчасць — гэта праца ад душы. Вы, Любоў Дзмітрыеўна, пацвярджаеце гэта справаю.

А. БРАІЛОЎСКІ.

ЗЯЛЁНЫ ЎБОР ГОРАДА

Спякотна... І толькі адзін надзейны сябра можа схаваць ад прамяніў. Сябра гэты — зялёныя дрэвы. Сёння ў Гомелі не трэба шукаць зялёных астраўкоў. Ад вакзала па праспекту Леніна, па Савецкай вуліцы да Касцюкоўкі — суцэльная алея. На новых і старых вуліцах, у цэнтры і на ўскраінах — зеляніна, зеляніна, зеляніна... З кожным годам яе становіцца ўсё больш і больш.

Кіраўнік гарадскога трэста зялёнага будаўніцтва тав. Чапурны гаворыць:

— Сёлета высаджана на вуліцах і ў скверах горада 11,8 тысячы дрэў —клёны, ліпы, каштаны, пірамідальныя таполі, 950 тысяч розных кветак, 78,5 тысячы кустарнікаў. Многае трэба яшчэ зрабіць да канца года — высадзіць 23,2 тысячы дрэў, дзесяткі тысяч кустарнікаў...

Для таго, каб паспяхова справіцца з гэтай задачай, патрэбны добрая база і ініцыятыўныя людзі. І тое і другое ў Гомелі ёсць. На 65 гектарах раскінуўся гадавальнік, у якім 750 тыс. дрэў і кустарнікаў. На поўную магутнасць працуе кветкавая аранжарэя, ідуць работы па стварэнню кветкавага камбіната плошчай у тысячу квадратных метраў. Ужо самі па сабе гэтыя фабрыкі зеляніны ўпрыгожваюць горад, а кольскі радасці і ўрачыстасці прынясуць яны на вуліцы, у паркі і скверы!

Зеляніна стала гордасцю Гомеля, яго своеасаблівай эмблемай. Паглядзіце на клумбы ў парку культуры і адпачынку, ля драмтэатра, на прывакзальнай плошчы — хіба гэта не творы мастацтва? Прайдзіцеся па маладой алеі на вуліцы Перамогі, дзе пасля вайны ляжалі горы цэглы і стаялі абгарэлыя сцены, а цяпер — сотні каштанаў і таполяў, кустарнікаў і кветак...

Гомельскі парк культуры і адпачынку — пераможца ўсесаюзнага агляду паркаў.

Так, у Гомелі парк, якім нельга не ганарыцца, які нельга не любіць. Старажытны і юны, старанна дагледжаны, вясёлы і шматлюдны.

А сёння ў розных канцах горада ўзніклі зялёныя масівы. Ля цагельнага завода № 17 на плошчы 9,8 га энтузіясты-актывісты пасадзілі 1850 дрэў — і шуміць лістота ў новым парку Прыазёрным, на былым пустыры. Паспелі ўжо стаць любімым месцам адпачынку маладыя паркі ў мікрараёне Фестывальны і ля кінатэатра імя Барыціна. У Нова-Беліцы хутка прыме першых адпачываючых вялікі лесапарк. Паркамі сталі тэрыторыі многіх прамысловых прадпрыемстваў горада.

Д. КУСКОЎ.

На здымку — праспект імя Ул. І. Леніна ў Гомелі.

Фота В. СТАРЧАНКОВА.

КВАТЭРА. ЯК ЯЕ АБСТАЛЯВАЦЬ?

Кватэра. Як яе абсталяваць?

З такім пытаннем сутыкаецца кожны, хто збіраецца стаць наваселам. У пісьмах, якія прыходзяць у рэдакцыю, нашы чытачы пытаюцца і пра тое, як афарбаваць сцены і як расставіць мэблю. Л. Буран, напрыклад, піша: «Парайце, як лепш расставіць мэблю, каб выцягнуты ў даўжыню пакой «стаў бы» шырэйшы, каб паветра, святло, прастора былі выкарыстаны найлепшым чынам. Якую мэблю лепш купіць, улічваючы выбар у нашых магазінах».

Друкуем артыкул галоўнага спецыяліста лабараторыі буйнаэлементнага домабудавання Інстытута будаўніцтва і архітэктуры Дзяржбуда БССР І. Харламава. Ён расказвае пра тыя галоўныя прынцыпы, якімі трэба кіравацца пры абсталяванні сучаснага жылля.

Памеры сучаснай кватэры з вышынёй памяшкання ў два з палавінаю метры патрабуюць разумнага скарыстання яе прасторы і плошчы. Імкненне зрокава пашырыць памяшканне і звязаць яго са знешнім асяроддзем—аснова кампазіцыйных вырашэнняў сучаснага інтэр'ера, пры якіх выкарыстоўваюцца ўсе сродкі мастацкай выразнасці.

Ва ўмовах аднасямейнага засялення падсобная плошча — рэзерв жыллёвай. У адрозненне ад камунальнай кватэры тут знікае розніца паміж гэтымі плошчамі. Дапушчальным становіцца прахадны агульны пакой, памеры якога павялічваюцца за кошт унутрыкватэрных калідораў. У новых эксперыментальных жылых дамах запраектаваны кухні-нішы, якія з'яўляюцца часткай агульнага пакоя і аддзяляюцца ад яго лёгкай рассоўнай перагародкай або мэбляю. Праходзяць эксперыментальную праверку кватэры са свабоднай планіроўкай, дзе большасць унутраных перагародак могуць перастаўляцца самімі жыхарамі.

Сучасная кватэра — не механічны набор ізаляваных жылых і падсобных памяшканняў, а адзіны аб'ём, які складаецца з зон разнастайнага прызначэння: для гатавання страў, адпачынку, заняткаў і г. д. Такое аб'яднанне некалькіх памяшканняў спрыяе адноснаму павелічэнню прасторы.

Перавага цяпер аддаецца ўбудаванаму і навеснаму абсталяванню, бо яно пры зборцы і мантажы арганічна ўпісваецца ў інтэр'ер. Пры ўстаноўцы прысценнай шафы, як правіла, запаўняецца ўвесь прасценак ад падлогі да столі, чым падкрэсліваецца цэласнасць вонкавай плоскасці. Шафа зрокава ўспрымаецца як нейтральны фон для больш дробных перасоўных прадметаў і самога чалавека. Прадметы абсталявання не прыцягваюць да сябе ўвагі, і памяшканне здаецца больш прасторным. Калі няма неабходнасці рабіць шафы на ўсю вышыню памяшкання, тады секцыі навешваюцца на сцяну нізкім поясам, які аб'ядноўвае такія прадметы, як ложак, канапа і інш., ад чаго памяшканне здаецца больш высокім. Ва ўмовах жыллёвага будаўніцтва Беларусі ёсць самыя шырокія магчымасці для выкарыстання гэтага эканамічнага і зручнага для падтрымання чысціні і парадку віду абсталявання.

Для групіроўкі асобных прадметаў мэблі і іх зрокавай сувязі з абстаноўкай робяць аднолькавай вышыні нізкія секцыі шафаў, спінкі ложка і канапы або мяккую мэблю і часопісны столік. Унутраны каркас і бакавыя сценкі прысценнай шафы афарбоўваюць у колер сцяны, а ў ашклёнай частцы не робяць задняй сценкі. Паміж канапай, часопісным столікам і крэсламі для адпачынку рассцілаюць дыван, які аб'ядноўвае гэтую групу. Такім чынам пазбаўляюцца рознахарактарнасці ў інтэр'еры. Пры гэтым асаблівую ролю набывае ўменне правільна спалучаць форму, колер, фактуру, асветленасць і іншыя якасці прадметаў абстаноўкі, уменне аб'ядноўваць іх у гарманічны ансамбль.

Масавая вытворчасць, механічныя спосабы апрацоўкі і аддзелкі матэрыялаў у сваю чаргу адкрылі новыя дэкаратыўныя якасці. Секцыйная і універсальна-разборная мэбля можа лёгка змяняць свае прапорцыі ў залежнасці ад расстаноўкі і прызначэння, мяняючы аблічча інтэр'ера. Вялікія матавыя і чыста апрацаваныя паверхні сучаснай мэблі не кідаюцца ў вочы і добра спалучаюцца з фактурнымі керамічнымі вырабамі, натуральнай зелянінай, прыгожымі тканінамі, каляровымі пераплётамі расстаўленых кніг.

Колер — таксама актыўны сродак, які ўплывае на зрокавае ўспрыняцце прасторы памяшкання. Каб пазбавіцца, напрыклад, ад уражання занадта выцягнутага пакоя (што часта бывае пры існуючай планіроўцы кватэр), афарбоўваюць тарцовую сцяну больш інтэнсіўным, цёплым колерам або абклейваюць шпалерамі таго ж колеру. Афарбоўка пакоя ў светла-блакітныя тоны прымушае сцены як бы адступаць і стварае ўражанне прасторы, і, наадварот, цёпла-карычневая гама стварае ілюзію цеплыні і ўтульнасці, робіць пакой больш замкнёным. Калі сцены і столь нізкага памяшкання афарбаваць адным і тым жа светлым тонам, дык гэтым можна пазбавіцца ўражання нізкай столі. Цёплыя светлыя тоны паляпшаюць асветленасць памяшкання.

Правільна карыстаючыся ўздзеяннем колеру, можна стварыць уражанне цяпла і холаду ў адным і тым жа памяшканні.

Каб нейтралізаваць гарачыню сонечнага асвятлення, рэкамендуецца памяшканні з вокнамі на паўднёвы захад фарбаваць у колеры халоднай часткі спектра — светла-зялёны, блакітны, бэзавы, светла-фіялетавы, а памяшканні, арыентаваныя на паўночны ўсход, у цёплыя тоны — светла-карычневы, охраста-жоўты, светла-аранжавы, крэмавы, гарчычны, светла-табачны, цёпла-зялёны. У тых выпадках, калі кватэра арыентавана адначасова на паўночны ўсход і паўднёвы захад і памяшканні афарбоўваюцца ў кантрастныя колеры,— яны бяруцца разбеленымі. Гэтым змякчаецца інтэнсіўнасць кантрасту і паляпшаецца колерная гармонія ўсёй кватэры.

Самае характэрнае колернае вырашэнне жылога інтэр'ера такое, калі ствараецца агульны нейтральны фон спакойных колерных спалучэнняў, а на ім кантрастна выдзяляецца невялікая частка інтэр'ера або асобныя прадметы. Гэтым дасягаецца прыгажосць гучання, лёгкасць агульнага вырашэння. Інтэнсіўныя кантрастныя спалучэнні часцей за ўсё выкарыстоўваюцца ў пярэднім пакоі, гасціным кутку агульнага пакоя або ў месцы для гульні дзяцей. Кантрастныя спалучэнні колераў пры працяглым уздзеянні стамляюць чалавека. Таму яны ў жылым інтэр'еры выкарыстоўваюцца рэдка. Асабліва трэба пазбягаць такіх спалучэнняў у спальных пакоях і ў месцах для заняткаў. Неабходна ўлічваць афарбоўку не толькі асобных памяшканняў, але і прадметаў абстаноўкі і ўбранства, якія дапаўняюць і ўзмацняюць адзін аднаго.

Колерны клімат пакоя можа мяняцца. Напрыклад, калі драпіровачная тканіна ля акна ў вячэрні час закрывае ўсю вонкавую сцяну, яе колерная пляма рэзка павялічваецца і пачынае дамініраваць, прымушаючы іншыя колеры мяняць сваё гучанне. Калі гэтыя змены падтрыманы адпаведным чынам з дапамогаю штучнага святла, дык колерны лад можа мяняцца да непазнавальнасці.

У сучасным інтэр'еры ўсяляк падкрэсліваецца сувязь памяшкання са знешнім асяроддзем. Вокны драпіруюцца не толькі для таго, каб у патрэбны час можна было ізаляваць памяшканне або палепшыць яго асвятленне. Адначасова ствараецца ўражанне вялікага праёма на ўсю вышыню і шырыню вонкавай сцяны. Ўражанне таго, што інтэр'ер ад экстэр'ера аддзяляюць толькі празрыстае шкло і лёгкая тканіна, станоўча ўплывае на псіхіку чалавека. Сувязь з экстэр'ерам таксама зрокава павялічвае аб'ём кватэры.

Паколькі цяпер мэбліроўка і ўбранства кватэры робяцца жыхарамі без непасрэднага ўдзелу архітэктара або мастака, дык і поспех гэтай работы ў канчатковым выніку залежыць ад іх густаў, жаданняў і магчымасцей.

Інтэр'ер сучаснай кватэры дае неабмежаваную прастору для праяўлення самадзейнай творчасці самых шырокіх слаёў насельніцтва. Каб правільна скіраваць гэтую самадзейнасць, выхаваць густ насельніцтва і паказаць сучасныя дасягненні ў інтэр'еры, робяцца выстаўкі. Цяпер яны ўсё часцей наладжваюцца ў магазінах, дзе пакупнік можа па вартасці ацаніць кожную рэч і зрабіць правільны выбар таго, у чым ён мае патрэбу.

І. ХАРЛАМАЎ.



Прыклад спалучэння некалькіх прадметаў у адзін блок (рабочы стол, чарцёжная дошка, паліцы і секцыі для кніг, канапа-ложак і тумба для бялізны з нізкім бар'ерам).

Мал. архітэктара Ю. ГРЫГОР'ЕВА.

ПАЎЖАРТАМ, ПАЎСУР'ЁЗНА

Без слоў.



«Дзе гэта вуліца, дзе гэты дом?..».

Перавагі паркету...



«Кубізм» у архітэктуры.

ВАНДА ЛЬВОЎНА ВАСІЛЕЎСКАЯ

Не стала Ванды Львоўны Васілеўскай. Цяжкім болем адгукнецца гэтая вестка ў сэрцах сумленных людзей усяго свету. Памёрла слаўная дачка польскага народа, выдатная савецкая пісьменніца, член КПСС, лаўрэат Дзяржаўных прэмій, член Сусветнага Савета Міру, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР.

Дваццаць пяць гадоў таму назад у вераснёўскі дзень вырвалася яна з палаючай, разбуранай фашыстамі Варшавы і пайшла на ўсход насустрач Чырвонай Арміі, насустрач Краіне Саветаў.

Савецкі народ гасцінна прыняў у сваю сям'ю мужную дачку польскага народа, палюбіў яе натхнёную творчасць. Праявіў высокае давер'е, выбраўшы яе ў савецкі парламент, членам якога яна была да апошняга часу. Савецкая Украіна стала яе другой Радзімай. З 1941 года Ванда Васілеўская — член КПСС.

Вялікі творчы шлях прайшла Ванда Львоўна. Нарадзіўшыся ў 1905 годзе ў гор. Кракаве ў сям'і вядомага польскага публіцыста і палітычнага дзеяча, яна з юнацкіх гадоў стала ў рады рэвалюцыйнага студэнцтва, вяла актыўную прапагандысцкую работу сярод рабочых, арганізоўвала дапамогу палітзняволеным. У той жа час Ванда Львоўна разгарнула актыўную барацьбу супраць фашызму, выкрываючы яго ў сваіх палымяных творах. Апроч кнігі «Аблічча дня» — пра польскіх рабочых і сялян, яна напісала да 1939 года раманы: «Радзіма», «Зямля ў ярме», «Полымя на балотах», дзе з вялікай мастацкай сілай паказала цяжкое жыццё польскіх працоўных, іх рэвалюцыйную барацьбу супраць прыгнятальнікаў. У гады Вялікай Айчыннай вайны Ванда Львоўна ідзе добраахвотнікам у рады Савецкай Арміі і як палітработнік-агітатар выступае перад байцамі на перадавых пазіцыях. Сваімі натхнёнымі публіцыстычнымі артыкуламі, баявымі нарысамі, якія публікаваліся ў цэнтральным армейскім друку, яна клікала на смяротны бой з лютым ворагам чалавецтва. Яе хвалюючая і гнеўная аповесць «Радуга», удастоеная Дзяржаўнай прэміі, адыграла ролю вострай ідэйнай зброі ў дні Вялікай Айчыннай вайны.

Ванда Васілеўская ўзначальвала саюз польскіх патрыётаў, прымала ўдзел у фарміраванні Войска Польскага, а таксама была намеснікам старшыні Камітэта нацыянальнага вызвалення Польшчы. За сваю дзейнасць у час вайны яна была ўзнагароджана ордэнамі Польскай Народнай Рэспублікі.

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны Ванда Львоўна з уласцівай ёй палымянасцю і рэвалюцыйнай страснасцю ўключаецца ў барацьбу за мір, становіцца членам Сусветнага Савета Міру. У гэты час яна публікуе новыя выдатныя творы: «Песня над водамі», «Проста каханне», «У цяжкай барацьбе», «Калі загарыцца святло» і многія іншыя кнігі, прынятыя на духоўнае ўзбраенне мільёнамі чытачоў.

Напісанае сумесна з Аляксандрам Карнейчуком лібрэта «Багдан Хмяльніцкі» з'явілася выдатнай асновай для стварэння цудоўнай патрыятычнай оперы.

Савецкі ўрад высока ацаніў творчасць і грамадска-палітычную дзейнасць Ванды Васілеўскай, узнагародзіўшы яе многімі ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза.

Нас пакінуў вялікі патрабавальны мастак, пісьменнік-рэвалюцыянер, пакінуў у поўным росквіце сіл і ад гэтага яшчэ больш востры боль страты. Жыццё, нястомная літаратурна-грамадская дзейнасць Ванды Васілеўскай, прысвечаная барацьбе за камунізм, заўсёды будзе ўзорам партыйнага служэння пісьменніка савецкаму народу, натхняючым прыкладам для ўсіх людзей, якія змагаюцца за свабоду і шчасце народаў.

М. С. Хрушчоў, Л. І. Брэжнеў, А. І. Мікаян, М. В. Падгорны, М. А. Суслаў, П. Е Шэлест, Ю. В. Андропаў, Л. Ф. Ільічоў, В. І. Івашчанка, І. П. Казанец, Н. Т. Кальчанка, В. Г. Камяхоў, Д. С. Каротчанка, А. П. Ляшко, І. С. Сенін, Н. А. Собаль, В. В. Шчарбіцкі, І. С. Грушэцкі, А. Д. Скаба, В. І. Драздэнка, В. К. Кліменка, П. К. Кашавой, М. П. Геаргадзе, М. П. Бажан, А. Ц. Ганчар, Л. Д. Дзмітэрка, Ю. А. Збанацкі, В. П. Казачэнка, П. С. Казланюк, В. П. Камісарэнка, А. Е. Карняйчук, М. І. Котаў, А. С. Левада, Г. М. Маркаў, П. І. Панч, Д. А. Палікарпаў, Н. В. Папова, Н. С. Рыбак, Д. В. Скабельцын, Ю. К. Смоліч, В. І. Снасцін, В. М. Сабко, Л. С. Собалеў, Ул. М. Сасюра, М. А. Стэльмах, А. А. Суркоў, М. С. Ціханаў, М. Турсун-Задэ, П. Р. Тычына, К. А. Федзін, М. А. Шолахаў, І. Р. Эрэнбург.

Кіеў. Саюз пісьменнікаў Украіны

Дарагія сябры!

Мы глыбока смуткуем з поваду заўчаснай смерці выдатнай савецкай пісьменніцы, грамадскага дзеяча, палымянага барацьбіта за мір паміж народамі, нашага вялікага сябра Ванды Львоўны Васілеўскай і выказваем усім вам, сям'і набожчыцы сваё шчырае спачуванне.

П. Броўка, К. Крапіва, М. Лынькоў, П. Глебка, М. Танк, А. Куляшоў, П. Панчанка, Я. Брыль, І. Шамякін, І. Мележ.

Дні польскай культуры

У ГАСЦІНЕ САРДЭЧНАЙ І ШЧЫРАЙ

Паэт Аляксандр Баршчэўскі (Алесь Барскі) у складзе дэлегацыі Таварыства польска-савецкай дружбы прымаў удзел у Днях польскай культуры ў Беларусі. Мы папрасілі яго на старонках нашай газеты падзяліцца ўражаннямі ад знаходжання ў нашай рэспубліцы, ад сустрэч на беларускай зямлі. Артыкул А. Баршчэўскага, які мы змяшчаем сёння, перакладаць нам не давялося — ён быў напісаны па-беларуску.

Калі мінаеш дзяржаўную мяжу, заўсёды хвалюешся. Так было і на гэты раз. Хваляваліся не толькі тыя, хто ехаў у Савецкую Беларусь упершыню, але і тыя, хто быў тут раней. Хваляванне выяўляецца па-рознаму: у залішне ажыўленай гамонцы адных, у маўчанні другіх ці ў задумённым сузіранні краявідаў трэцімі. Хваляваўся і я, нягледзячы на тое, што польска-савецкую мяжу перасякаў каля дзесяці разоў...

За акном мільгаюць палі, лясы— мільгаюць думкі, мільгаюць успаміны. Я сяджу ў адным купэ са старой жанчынай—доктарам Флёрай Перавалоцкай. Бачу, як прагна ўзіраецца яна ў краявіды, як задумённа блішчаць яе вочы, як выбягае яна думкамі не то ў далёкія прасторы, не то ў далёкія ўспаміны. Маўчыць.

Мы ўмеем берагчы права чалавека на адзіноту—і таму ўсе суседзі па купэ не перапыняюць цішыню. Урэшце адзываецца сама доктар.

— Можа, вас здзіўляе перамена ў маіх паводзінах, але я, бачыце, не была тут каля трыццаці гадоў. Проста хвалююся.

Гэтае хваляванне яшчэ больш акрэслена прыйшлося мне ўбачыць на другі дзень у Мінску, калі доктар Флёра Перавалоцкая ў часе сустрэчы ў Міністэрстве культуры ўзрушаным голасам, са слязамі на вачах заявіла:

— Рэдка знаходзілася я ў абставінах, калі слёз не саромеешся, калі яны цешаць. І вось я ў вашай сталіцы ў такім становішчы, што слёзы мае— праява радасці. Сённяшні Мінск нельга ні ў якім выпадку параўнаць са старым, які я бачыла ў дваццатыя гады. Гэта адзін з найпрыгажэйшых гарадоў свету. Народ, які збудаваў такі горад, мае несумненна вялікае, шчырае і маладое сэрца.

Слухаю ўважліва словы старой камуністкі і разумею яе ўзрушанасць, бо сам глыбока ўражаны і пераменамі ў раёне плошчы Якуба Коласа, і новымі мікрараёнамі, і новым афармленнем дамоў, і новым выглядам жыхароў сталіцы. А я ж не быў у Мінску ўсяго чатыры гады. Пастаянны рост, зменнасць бадай што з'яўляюцца найбольш характэрнай рысай краіны, дзе, як гаварыў Фучык, «дзень сённяшні з'яўляецца днём учарашнім».

Трэба, несумненна, даўжэйшы час, каб упарадкаваць і асэнсаваць уражанні, выкліканыя сустрэчамі з людзьмі Беларусі, аднак ужо зараз можна сказаць пра галоўнае—пра бязмежную шчырасць і гасціннасць гаспадароў. Дзе б мы ні былі, заўсёды нам здавалася, што насустрач нам выйшла з адкрытым сэрцам уся Беларусь, запрашаючы за гасцінны стол.

Думаю, не памылюся, калі скажу, што ў гісторыі польска-беларускіх сувязей не праводзіліся ніколі такія грандыёзныя мерапрыемствы, прысвечаныя жыццю братняга народа, як гэта мы бачылі зараз у Беларусі.

Газеты, радыё, тэлебачанне, установы, арганізацыі—усё працавала ў напрамку папулярызацыі сучаснай Польшчы. Усюды, дзе б мы ні былі— у Салігорску, у Навагрудку, у Леніна, у Магілёве, на Гомельшчыне,— усюды траплялі на сляды нашых папярэднікаў палякаў, якія прыязджалі сюды раней. Усюды мясцовыя таварышы прасілі нас перадаваць прывітанні або запрашэнні тым нашым землякам, якія былі ў іх месяц, год ці некалькі гадоў таму назад. Ці ж гэтая памяць не сведчыць аб тым, што нашы сустрэчы—гэта ні ў якім выпадку не проста афіцыйная неабходнасць, а патрэба сэрца?

Нельга прамаўчаць і пра другое. У многіх месцах Беларусі сустракалі мы сляды супольнасці нашага мінулага: Навагрудак і Міцкевіч, Івянец і Дзяржынскі, Леніна і Першая дывізія імя Касцюшкі. Сустракалі мы ўрэшце жывых людзей, якія сваёй крывёю плацілі за свабоду Польшчы ў гады мінулай вайны. І хочацца пакланіцца гэтым людзям—партызанам і салдатам Савецкай Арміі.

Нельга таксама абысці сустрэч з беларускімі пісьменнікамі. У іх асяроддзі знаходзілі мы нямала вялікіх сяброў Польшчы: Янку Брыля—абаронцу польскага ўзбярэжжа ў 1939 годзе, Язэпа Семяжона—маёра Савецкай Арміі, удзельніка вызвалення паўночных раёнаў Польшчы, Максіма Танка—выпрабаванага і вернага друга нашай краіны...

Незабыўнымі астануцца і сустрэчы з кіраўніцтвам Салігорска, з партыйнымі дзеячамі Маладзечна, з урачом санаторыя «Нарач» Ліліяй Паўлючэнка, з дзецьмі ў лагеры «Лясная казка», з кіраўніцтвам і насельніцтвам Віцебска, Магілёва, Гомеля, з цэлым беларускім народам, які па наказу сэрца выйшаў на спатканне з нашай дэлегацыяй.

Яшчэ раз хацелася б паўтарыць словы: гасціннасць і сардэчнасць беларускага народа бязмежная і бяздонная. І таму хацелася б у гэта бяздонне кінуць грошык свайго сэрца, каб яшчэ раз сюды вярнуцца. І таму яшчэ раз хацелася б падзякаваць усім тым беларускім дзеячам, якія стварылі нам магчымасць шырокага азнаямлення з вашай краінай. І таму яшчэ раз хочацца пакланіцца ўсёй Беларусі—сястры нашай сардэчнай і шчырай, з якой дзялілі мы гора ў мінулым, з якой дзелім супольную працу ў сучасным і з якой падзелім шчасце ў будучым.

Аляксандр БАРШЧЭЎСКІ.

ФІЛЬМЫ Ў ЖНІЎНІ

...Ля зарослага травою, заваленага акопа спыняецца таксі. З машыны выходзіць сівы чалавек. Гэта былы франтавік Мяцелеў. Дваццаць гадоў назад ён ваяваў у гэтым акопе, а побач былі яго таварышы — весялун Батура, радыстка Ніна Паўлоўская, якая марыла пасля вайны стаць піяністкай, і ваенфельчар Бродаў. Якія сталі яны пасля вайны? Пра гэта Мяцелеў — герой новай мастацкай кінааповесці «Сорак мінут да світання», створанай рэжысёрам Б. Рыцаравым на кінастудыі «Беларусьфільм» па сцэнарыі Р. Вікерса і А. Канеўскага,— не ведае. Але ўяўляе сваіх сяброў сумленнымі, моцнымі, мужнымі... Пра іх, былых воінаў, сённяшніх будаўнікоў камунізма расказвае гэты фільм. Галоўныя ролі ў гэтай карціне выконваюць Г. Стрыжэнаў, Л. Даніліна, В. Баландзін і К. Яніцкі.

З цікавасцю паглядзяць гледачы і новую кінакарціну «Дзень шчасця» вытворчасці студыі «Ленфільм». (Аўтары сцэнарыя Ю. Герман і І. Хейфіц, рэжысёр-пастаноўшчык І. Хейфіц). У жыцці герояў гэтага кінатвора няма нічога незвычайнага. Яны кахаюць, пакутуюць, памыляюцца,—нялёгка даецца ім сапраўднае шчасце... Такі сюжэт фільма. У галоўных ролях у ім здымаліся папулярныя кінаакцёры Т. Сёміна, А. Баталаў, В. Зубкоў, М. Кручкоў пра рэпку, хованкі, агуркі ведаюць і дзеці, і дарослыя. І не дзіва, што кінематаграфісты вырашылі экранізаваць папулярныя дзіцячыя кніжкі. На экраны рэспублікі выходзіць дзіцячая мастацкая кінааповесць «Прыгоды Толі Клюквіна» вытворчасці кінастудыі імя М. Горкага. Яна расказвае пра вучобу, сяброўства і прыгоды хлопчыка. Пастаноўку карціны ажыццявіў рэжысёр В. Эйсымонт.

Кадр з фільма «Дзень шчасця».

Кінастудыя імя М. Горкага даўно ўжо дапамагае Усесаюзнаму дзяржаўнаму інстытуту кінематаграфіі. У яе сценах паставілі свае дыпломныя фільмы многія студэнты. Успомнім хоць бы «Кар'еру Дзімы Горына» або «Венскі лес», якія карысталіся поспехам.

У жніўні выйдуць яшчэ дзве работы дыпламантаў інстытута, знятыя на гэтай студыі, — шырокаэкранныя фільмы «Сланечнік» (аўтар сцэнарыя В. Закруткін, пастаноўка дыпламанта П. Арсенава) і «Цётка з фіялкамі» (сцэнарый А. Грабнёва, пастаноўка дыпламанта П. Любімава).

Даўным даўно любяць юныя чытачы аповесці і апавяданні дзіцячага пісьменніка М. Носава «Вясёлая сямейка», «Дзённік Колі Сініцына», «Віця Малеў у школе і дома» і іншыя. Вясёлыя гісторыі

Арт. Г. Стрыжэнаў у ролі Мяцелева («Сорак мінут да світання»)

Убачаць гледачы і новую казахскую кінакарціну «Мяне завуць Кожа», створаную рэжысёрам А. Карсакбаевым па матывах аднайменнага твора Б. Сакпакбаева. Гэты фільм закранае пытанні школьнага выхавання, у ім паказаны складаныя ўзаемаадносіны дзяцей.

На экранах рэспублікі будуць таксама дэманстравацца ў жніўні новая мастацкая кінааповесць «Вяртанне Веранікі» вытворчасці кінастудыі імя А. Даўжэнкі і таджыцкі мастацкі фільм «Любіць— не любіць».

З хранікальна-дакументальных і навукова-папулярных фільмаў будуць дэманстравацца карціны — «Шчасце табе, Малі», «Вялікі Ленінград», «Мастацтва мільёнаў», «Карабель асобага прызначэння», «Ад двух да васемнаццаці» і іншыя.

З зарубежных кінакарцін гледачы змогуць паглядзець венгерскую — «Як справы, малады чалавек?», румынскую — «Тудар Уладзімірэску», югаслаўскую — «Любімчык камандзіра», індыйскую — «Глядзі, відаць дарога», чылійскую — «Калі б мая зямля гаварыла», амерыканскую — «Стук паштальёна» і інш.

УЗНАГАРОДЫ ФОТАМАЙСТРАМ

У памяшканні Беларускай філармоніі, дзе экспанавалася пятая Рэспубліканская фотавыстаўка «Сямігодка ў дзеянні», адбылося пасяджэнне журы выстаўкі. За лепшыя работы ўдзельнікам выстаўкі прысуджаны ўзнагароды:

ДЫПЛОМЫ І СТУПЕНІ —

В. Бараноўскаму за работы: «Для Пінскай флатыліі», «Палескія рабінзоны»;

А. Дзітлаву за серыю работ «Была вайна».

ДЫПЛОМЫ II СТУПЕНІ —

А. Аўдзееву за каляровыя работы: «У месячную ноч», «Першыя праменні», «Асенняя раніца»;

А. і М. Ананьіным за работы: «Родныя мясціны» (каляровая), «Зноў ля партызанскага калодзежа»;

Т. Ананьінай за работу «Я з азотнатукавага!»;

Ул. Дагаеву за работу «Крокі па расе»;

В. Ждановічу за каляровую работу «Вясеннія клопаты»;

Ю. Іванову за работы: «Юнацтва», «Да хуткай сустрэчы!»;

М. Мінковічу за работу «Мінскія ткачыхі»;

А. Мызнікаву за работу «Рэпліка»;

Д. Прэсу за работы: «Пабрацімы», «На ўспамін аб перамозе» (з серыі «Героі абароны Брэсцкай крэпасці».)

ДЫПЛОМЫ III СТУПЕНІ —

Ф. Бачылу за работы: «Дарункі зямлі», «Апоўдні»;

Я. Камарову за работы: «Абуджэнне», «Вечарэе», «Люты»;

В. Карагіну за работы: «У далёкі рэйс», «Будзе навальніца»;

І. Ламановічу за работу «Ваўчатнікі»;

М. Санкевічу за работу «Радасць руху»;

Д. Церахаву за работу «Залаты скачок»;

М. Шараю за работу «Анютка»;

Л. Эйдзіну за работу «Марыя Шаўчэнка — аграном».

Затым адбылося абмеркаванне работ фотавыстаўкі. З аглядам выступілі карэспандэнт фотахронікі ТАСС Л. Портэр, крытык Ул. Юрэвіч, фотамайстры І. Салавейчык і М. Ананьін, фотааматары М. Байцоў, В. Ждановіч і іншыя.

Радыёслужба

31 ліпеня

Першая праграма. 17.25—праграма перадач. 17.30 — «І для звераят ёсць дзіцячы сад». Перадача з пляцоўкі маладняку Маскоўскага заапарку (М). 18.00 — «Дзень чыгуначніка». Расказ аб лепшых людзях чыгункі. 18.40 — тэлевізійныя навіны. 19.00—спекталь Кіеўскага тэатра музыкі.

Другая праграма. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — «Веды». Тэлечасопіс (М.) 19.00—канцэрт артыстаў Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета Грузінскай ССР імя Паліашвілі. Перадача з Крамлёўскага Палаца з'ездаў. У перапынку—тэлевізійныя навіны (М). 22.00—«Горная жамчужына». Кінанарыс (М).

1 жніўня

Першая праграма. 16.55—праграма перадач. 17.00—спартыўная перадача. 18.45—«Навіны з блакітнага экрана». 19.30—канцэрт, прысвечаны Дню чыгуначніка (М). 22.00—тэлевізійныя навіны (М). 22.30—«На агеньчык» (М).

Другая праграма. 16.25 — праграма перадач (М). 16.30—для школьнікаў. «Мы пасябравалі ў Артэку». Канцэрт (М). 18.00—тэлевізійныя навіны (М). 18.15 — «Чалавек павінен жыць доўга» (М). 19.00—«Іх убачаць у Токіо» (М). 19.30—«Каралева бензакалонкі». Кінакамедыя. 20.40—канцэрт Дзяржаўнага харэаграфічнага ансамбля «Бярозка».

2 жніўня

Першая праграма. 10.55—праграма перадач. 11.00—«Скарбы Трацяцкоўскай галерэі» (М). 11.40 — «Чароўны туфлік». Мастацка-музычны фільм. 12.20—мастацкі фільм «Гутаперчавы хлопчык». 16.25—праграма перадач. 16.30—«Уперадзе—зялёны». Перадача, прысвечаная Дню чыгуначніка (М). 17.00 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Служаць хлопцы ў Літве». Перадача з Вільнюса. 18.00 — «Ля самага Ціхага». Дакументальны фільм. 18.30 — «Папулярныя артысты чэшскай эстрады». Канцэрт. 19.20 — «Калі твая праўда». Мастацкі фільм. 20.40 — «Подзвіг». Навукова-папулярны фільм. 21.00 — тэлевізійныя навіны (М). 21.30 — «Літаратурная Беларусь». Тэлечасопіс. 22.30 — «Жыве на свеце песенька». Сустрэча з кампазітарам П. Аеданіцкім (М).

Другая праграма. 11.00 — «Крэсівы» Мастацкі фільм. 17.00—музычны кіёск (М). 17.30—для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Армейскія кінааматары» (М). 18.00—тэлевізійныя навіны (М). 18.15—С. Антонаў. «У ціхай станіцы». Тэлеспектакль (М). 19.00—канцэрт народнай музыкі. Перадача з Кіева. 19.45—мастацкі фільм «Голы дыпламат» (М). 21.00—тэлевізійныя навіны (М). 21.30—«Мастацтва». Тэлечасопіс (М).

3 жніўня

Першая праграма. 17.25 — праграма перадач. 17.30 — для школьнікаў. «Незвычайнае ў звычайным». 18.00 — «Грыбок-церамок». Мультфільм. 18.10 — «Свята Савецкай Прыбалтыкі». Перадача з Вільнюса. 19.00—тэлевізійныя навіны. 19.20 — «Тры плюс два». Мастацкі фільм. 20.55—народны кантроль. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00—канцэрт.

Другая праграма. 17.25 — праграма перадач. 17.30 — для школьнікаў. «Нашы госці» (М). 18.00—тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — «Пошук працягваецца». Тэленарыс. 19.00—канцэрт. Перадача з Сафіі. 20.00—К. Паустоўскі «Снег і дажджлівае світанне». Прэм'ера тэлеспектакля (М). 21.00 — на прасторах Радзімы (М). 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00—наш прэс-цэнтр. 22.40 — галы, ачкі, секунды. Спорт за тыдзень (М).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

А Б' Я В А

Беллітфонд Саюза пісьменнікаў прадае пуцёўкі на жнівень — верасень месяцы 1964 г. у Дом творчасці і адпачынку пісьменнікаў імя Я. Коласа ў 25 км ад Мінска, у лесе.

Кошт пуцёўкі для дарослых 130 рублёў, для дзяцей — 110 рублёў на 24 дні.

Жадаючыя купіць пуцёўкі павінны падаць заяву па адрасу: Мінск, Энгельса, 9. Тэлефон -2-49-51.

БЕЛЛІТФОНД.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ:

г. Мінск, вул. Захарава. 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 3-19 52, бухгалтэрыі — 3-11 03.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».

Індэкс 63856 АТ 3017

6

БЫЎ ХМУРЫ САКАВІЦКІ ДЗЕНЬ...

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.).

Рыжы і рыжанькі ў калідоры лаяліся і наскаквалі адзін на аднаго, як пеўні.

— Гэта ты, мой пане, такі няўдалы... У твае гады я яго так бы сагнуў!—крычаў стары.

— А сам ты... Вунь і каўнер ён табе ададраў. Хоць бы па пыску яму ўсмаліў.

— Усмаліў!.. Ты малодшы, мой пане!..

Сцёпа падышоў да Антося і, абняўшы яго, сказаў:

— Які ж ты малайчына, Антось... Ну, паказаў ты рыжым! Няхай ведаюць, як займаць чужое месца.

Ліда і Таня трымаліся за Антосеву світку. Ён пацалаваў дзяўчынак і запытаў у старэйшага брата:

— Як думаеш, Алесь, не прападзём?

— Сілаю, Антось, нічога не дакажаш,—ціха прамовіў той.

Тым часам Антось убачыў «рыжага з постаці», які стаяў насупраць рыжых сына і бацькі і смяяўся. Ён адразу накіраваўся да яго. «Рыжы з постаці» нібы чакаў Антося і адразу працягнуў руку для прывітання.

— Здароў! Адкуль ты?

— З Малінаўкі.

— Чый?

— Андрэя Сташэвіча.

— Андрэя Сташэвіча!—узрадаваўся той.—Дык ты Андрэеў! Што чуваць пра бацьку? Дзе ён цяпер?

— Ты хіба ведаеш майго бацьку?

— Дзівак! Гэта ж мой сябра! Колькі мы з ім гарэлкі перапілі! Каб я Андрэя не ведаў або ён мяне!

— Пачакай, Адкуль жа ты?—зацікавіўся Антось.

— З Бранчыц. Рыгор Рожка. Хіба бацька не гаварыў?

— Чаму не гаварыў?.. Ты майму бацьку калёсы акоўваў.

— І не адны! Я, калі хочаш ведаць, каваль, сталяр, бондар, кажамяка, хром рабіць умею, аўчыны выраблялі... Вось хто я такі!

Ён зірнуў на рыжых шляхцюкоў, якія гатовы былі пабіцца між сабою, і зарагатаў.

— Малайчына! Я таксама з імі ваяваў. Цябе Антосем завуць?

— Антосем.

— Казаў пра цябе бацька. Хваліўся: вось гэта ў мяне сын. А вунь твой брат Алесь.

— Але. А вунь наш меншы, Сцёпа.

— На бацьку падобны ўсе тры. Што ж ён такі панура, Алесь твой?

— Сам ведаеш: ён цяпер самы старэйшы, гаспадар. Увесь клопат на яго галаве.

— Клопат! Няхай клапоціцца той, хто нас з дому выгнаў. Ды і сям'я ў вас моцная. Два ра-

7

ботнікі, а трэці паганяты. Праз год і ён работнікам будзе. А ў мяне старыя бацькі, зусім грыбы трухлявыя, жонка і двое малых. Адно яшчэ пры грудзях. І то я не вельмі баюся. Далей сонца не загоняць, а дзе ёсць сонца, там ёсць і жыццё. Вось праз такіх бізуноў,— ён паказаў на рыжых шляхцюкоў,—можа цяжка будзе. Такія табе заўсёды нагу падставяць... Аднак я не думаю. Антось, што ўлада нас на смерць павязе. Не веру. Усё-такі ўлада... Дык што пра бацьку чуваць?

— Мы пакінулі яго ў Цімкавічах тыдзень таму назад. Дзе ён цяпер—не ведаю...

Антось зноў успомніў расстанне з бацькам і схіліў галаву.

— Не бядуй! Твой бацька не загіне. Не такі ён чалавек... Слухай, Антось, калі на тое пайшло, і мы ўжо спазналіся, то давай разам трымацца. І ў дарозе і там, куды прывязуць.

— Я, Рыгор, таксама думаю. Я калі ўбачыў цябе, то адразу вырашыў не спускаць з цябе вачэй.

Пазнаёміўшыся з Рыгоравай сям'ёй, Антось спусціўся на першы паверх у надзеі знайсці кагонебудзь са сваіх школьных сяброў. Ён памалу крочыў па доўгім калідоры і заглядаў у кожны пакой.

Антось ужо вырашыў ісці назад, калі раптам пачуў вокліч:

— Антось! Пачакай!

Да яго імчаў Яраслаў Цераховіч, сябра па сямігодцы, калісьці сядзелі з ім на адной лаўцы. Расхлістаны, без шапкі, кучаравы, як баран, з чорнымі жвавымі вочкамі, той самы Слаўка, у якога заўсёды былі расшпілены ўсе гузікі. Ён і цяпер быў такі.

— Антось, братачка! І ты тут!

— І ты, Слаўка!

— Як я рад, што цябе ўбачыў! І сям'я тут?

— Тут. А твая?

Яраслаў махнуў рукой.

— Якая ў мяне сям'я, Антось! Я адзін,—ён уздыхнуў.—Маці памерла месяц таму назад... Бацька разам з тваім... Сястра замужам, брат жанаты. У іх свае сем'і, а я ім хто? Прышый кабыле хвост... Адзін я, Антось. Пакуль што каля брата Жэнькі аціраюся.

Яраслаў насцярожана азірнуўся і сказаў шэптам:

— Пагутарыць хачу з табой, Антось... Справа сур'ёзная. Давай пашукаем ціхага кутка...

Знайсці такі куток аказалася нялёгкай справай. Усе пакоі, калідоры і лесвіцы былі напоўнены людзьмі. Тады хлопцы падняліся на трэці паверх і апынуліся на пляцоўцы пад самай столлю.

— Выказвай сваю справу, Слаўка. Лепшага месца мы не знойдзем.

— Вялікая справа, Антось... Ведаеш!.. Скажы шчыра, што ты аб усім гэтым думаеш?

— Аб чым, Яраслаў?

— Ну ды вось аб высылцы гэтай... Куды нас павязуць? Што мы там будзем рабіць? І, нарэшце, табе хочацца туды ехаць?

— А табе хочацца?..

Яраслаў горка ўсміхнуўся.

8

— Мне вельмі хочацца, Антось... Мне хочацца, як у магілу... Аднолькава для мяне...

— От гэта ўжо глупства.

— Глупства? Ты скажы мне, які я злачынец? Злачынец у турме, а я ў чым правінаваціўся? Я ж цяпер адзін, як палец... Не да каго прыхінуцца. Нішто мяне ні да каго не прывязвае. Братава жонка рада была б, каб мяне нейкі чорт узяў. Не любіць яна мяне і глядзіць коса... А сястра нядаўна замужам, дык яны мілуюцца, як галубкі... Я для іх ёсць ці няма—усё роўна. Ведаеш, Антось? Я з вялікім здавальненнем махнуў бы...

— Куды, Яраслаў?

Цераховіч агледзеў Антося, потым зірнуў уніз, дзе хадзілі людзі, і, прытуліўшыся вуснамі амаль да самага Антосевага вуха, зашаптаў:

— Антось, мы з табою пяты год дружым... Тры гады на адной лаўцы сядзелі... Як браты жылі, і ў нас не было таямніц адзін ад аднаго... І ніколі не было, каб ты мяне выдаў або я цябе. Памятаеш, як ты залез праз акно на кватэру загадчыка і ўкраў у яго Ясеніна і рукапіснага Баркова... Тады ж я цябе падсаджваў і вартаўніком быў. Хто аб гэтым даведаўся?

— Ніхто, Слаўка. Але чаму ты так здалёк падыходзіш?

— Ты пытаешся, чаму? Таму што хачу табе сказаць, куды я думаю махнуць.

— Куды?

— Туды, Антось... за мяжу...

— У Польшчу?

Яраслаў кіўнуў галавой.

— Што ты там будзеш рабіць?

— Там у мяне бацькава радня. Дзядзька і цётка. Спачатку прытуліліся б у іх.

— Ты пра каго яшчэ думаеш?

— Як пра каго!—здзівіўся Яраслаў.—Пра цябе!

— Добра. Ну а потым?

— А потым?—ён зноў прытуліўся да Антосевага вуха.—Ты ведаеш, я чуў, што ў Луніцы і цяпер ёсць штаб Беларускай рады... Звязаліся б з імі і пачалі падпольную работу. Выдавалі б беларускія часопісы, газеты...

— Супроць каго падпольную работу?

— Супроць паноў... За Беларусь.

— Дзівак ты. Беларуская рада... Ды гэта банда, ты разумееш? Я ў Цімкавічах у адной камеры сядзеў з былым харунжым гэтай няшчаснай рады. Расказваў ён, што яны выраблялі. Пра Беларусь яны і не думалі... Уцёк ён адтуль у дваццаць чацвёртым годзе і атрымаў пяць гадоў Салаўкоў. Адбыў, дамоў вярнуўся і пачаў займацца кантрабандай. Зноў пасадзілі. Глупства, Яраслаў... Цяпер улічы, што мы без дакументаў. Палічаць за камсамольцаў і згноіяць у дэфензіве.

Яраслаў моўчкі слухаў Антося. Жвавыя яго вочкі цяпер глядзелі нерухома ў адну кропку на сцяне.

— І разумееш, Яраслаў, не люблю я ўсё-такі паноў. Не, браток, не люблю. А сам ты, помніш, якія хвацкія вершы пісаў пра паноў? Уся школа зачытвалася. Хаця... ты католік, ты радней ім, чым я.

9

Яраслаў раптам успыхнуў. Вочы яго гнеўна бліснулі.

— Не смей так гаварыць, Антось!—крыкнуў ён.—Не смей! Ты мяне ведаеш...

— Ціішэй ты, Слаўка, людзі начуюць.

— Ты мяне не абражай,—гарачым шэптам прадаўжаў Яраслаў.—Я не ведаю, хто мяне хрысціў, ксёндз ці поп, хоць сам чорт... А сам я не католік, не праваслаўны, я беларус! Ты думаеш, я да паноў імкнуся? Памыляешся! У мяне вышэйшая мэта, я мару аб самастойнай Беларусі! Я не хачу кідаць радзіму... Не даюць жыць на Усходзе, пайду на Захад.

— І там не дадуць, будзь упэўнены.

Антось мімаволі ўсміхнуўся. Ён успомніў гады вучэння ў сямігодцы, мары пра самастойную Беларусь. Тады ў Слуцку выкрылі Лістапада і лістападаўцаў. Іх судзілі, і ў вачах такіх вучняў, як Слаўка ды і ён сам, Лістапад быў героем. Яраслаў і тады быў самы гарачы «патрыёт»..

— Эх, Слаўка, я думаў, што ты ўжо забыў тую бязглуздзіцу. А ў цябе яшчэ засталося...

— Навек застанецца,—горача адказаў Цераховіч.—Гэта мэта жыцця.

Ён доўга маўчаў і глядзеў у акно, у якое біў дождж, нібы любаваўся, як узнікаюць на шкле мокрыя плямкі, як яны паступова расцякаюцца і знікаюць.

— Значыць, ты не хочаш са мною?—нарэшце запытаў ён.

— Не, Слаўка. Твая справа іншая, ты адзін. А на маёй шыі маці і меншыя. Нават і па гэтай прычыне я адмовіўся б.

Яраслаў Цераховіч па складу свайго характару не мог доўга быць задуменны і сумны. Ён мог горача і шчыра абараняць свае думкі і меркавачні, але толькі спачатку. Як чалавек, які хутка паддаецца чужому ўплыву, ён паступова згаджаўся з праціўнікам. Вочы яго зноў заблішчалі вясёлымі агеньчыкамі:

— Ведаеш, Антось, і Дзяніс Дым тут.

— Ты яго бачыў? Дзе ён?—радасна запытаў Антось, пачуўшы пра яшчэ аднаго друга па школе.

— На ніжнім паверсе, поруч са мною... А я ўжо і торбу на дарогу падры